

Мінскае метро — у рэжыме гатоўнасці!

СТАР. 2



Без «гаджэтаў» нас чакае апакаліпсіс?

СТАР. 6



Трайное свята прыгажосці

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

18 КРАСАВІКА 2014 г. ПЯТНІЦА № 72 (27682) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

■ Праблема і рашэнне

# «ТЭРЫТОРЫЯ» МАЛОГА БІЗНЕСУ БУДЗЕ ПАШЫРАЦЦА

## Прадпрымальнікаў падтрымаюць даступнымі крэдытамі

**Вынікі работы Міншчыны па развіцці малога і сярэдняга прадпрымальніцтва прааналізаваны падчас выязной нарады-семінара ў Маладзечне з удзелам намесніка Прэм'ер-міністра Беларусі Пятра Пракаповіча, намесніка старшыні Мінаблвыканкама Аляксандра Турчына, прадстаўнікоў Мінскага абласнога і гарадскога выканкамаў, дзелавых колаў.**

Удзельнікі нарады акрэслілі рэзервы і магчымасці прыватнага сектара, які займае чвэрць у эканоміцы краіны.

— У наступным годзе ўдзельная вага малога і сярэдняга бізнесу павінна быць не менш за 30%, а да 2020-га трэба выйсці на 50%. Гэта вельмі вялікі рост. Але ад яго залежыць будучыня Беларусі. Калі мы дасягнем такіх паказчыкаў, то зможам увайсці ў лік краін, што маюць высокі ўзровень эканамічнага развіцця, — падкрэсліў віцэ-прэм'ер. — Самае галоўнае — гэта работа на месцах. Большасць пытанняў трэба вырашаць у вобласці і раёнах па прынцыпе «аднаго акна», без бюракратыі, пры максімальных фінансавай, адміністрацыйнай і маральнай падтрымцы. Што тычыцца рашэнняў на ўзроўні рэспублікі, яны таксама вызначаны. Гэта, перш за ўсё, даступнасць крэдытных рэсурсаў.

Сапраўды, такая праблема існуе. У чым удзельнікі нарады пераканаліся яшчэ раз пры наведванні філіяла №1 СТАА «БеларДызайн», што ў Радашковічах. Прадпрыемства выпускае дэкаратыўную касметыку. Летась тут планавалі пабудаваць новую вытворчасць з запатрабаванай на рынку прадукцыяй. Але з-за немагчымасці атрымаць крэдыты справа затармазілася.

— І такіх прыкладаў у рэспубліцы вельмі шмат. Таму задача ўрада, Нацыянальнага банка ў бліжэйшы час зняць усе абмежаванні па крэдытаванні малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, — адзначыў **Пётр Пракаповіч**. — Гэта вялікая работа, але мы павінны справіцца для таго, каб вырашыць галоўную задачу — паскорыць развіццё высокаэфектыўных прадпрыемстваў, якія павінны заняць вядучае месца ў эканоміцы краіны.

Пры гэтым намеснік Прэм'ер-міністра дадаў, што ў наступным годзе на Міншчыне даведзеныя паказчыкі павінны выканаць на 35%, паколькі гэта сталічная вобласць.

— У вас у параўнанні з іншымі рэгіёнамі лепшыя ўмовы для работы суб'ектаў прыватнага бізнесу, высокі кадравы патэнцыял, які трэба максімальна выкарыстоўваць.

У сталічным рэгіёне на пачатку года прадпрымальніцкую дзейнасць ажыццяўлялі больш чым 56 тыс. суб'ектаў малога і сярэдняга бізнесу. Летась прыватны сектар унёс значны ўклад у бюджэт вобласці — 5,6 трлн рублёў, што ў 4,6 раза больш, чым у 2012-м. Разам з тым у Крупскім, Любанскім, Салігорскім, Старадарожскім раёнах удзельная вага паступленняў да гэтага сектара нязначная.

— Часта вынікі развіцця канкрэтнага рэгіёна залежаць ад 1-2 валаўтваральных прадпрыемстваў. Напрыклад, летась 80% абласнога аб'ёму прамысловай прадукцыі выраблена ў 6 рэгіёнах: Салігорскім, Мінскім, Барысаўскім, Слуцкім, Маладзечанскім і горадзе Жодзіна, — канстатаваў намеснік старшыні Мінаблвыканкама **Аляксандр Турчын**. — У сувязі з гэтым у мінулым годзе кожны раён атрымаў заданне па стварэнні новых вытворчасцяў. Такія ж планы даведзены да ўсіх і сёлета. Пры гэтым старшыні райвыканкамаў нясуць асабістую адказнасць за адкрыццё суб'ектаў, асноўнай дзейнасцю якіх з'яўляецца выпуск прамысловай прадукцыі.

Па словах Аляксандра Турчына, новыя вытворчасці дапамогуць вырашыць цэлы комплекс праблем малых гарадоў і населеных пунктаў: даць работу і заробак жыхарам, у тым ліку і моладзі, якая будзе ствараць сем'і, будаваць сваё жыллё, што значна паўплывае на дэмаграфічную сітуацыю. Як паказвае практыка, там, дзе створаны высокаэфектыўныя прадпрыемствы, людзі не ездзяць на працу ў Мінск, як раней.

Усяго ж летась у цэнтральным рэгіёне запрацавала больш як 200 новых прыватных прадпрыемстваў у прамысловасці, сферы гандлю і абслугоўвання. Разам з тым малы і сярэдні бізнес нераўнамерна асвойвае тэрыторыі. Найбольшым попытам карыстаюцца ўчасткі ў Мінскім раёне. Пакуль не вельмі ахвотна ідуць прыватнікі ў аддаленыя ад сталіцы раёны. Напрыклад, кошт плошчаў Барысаўскага прадпрыемства музычных інструментаў на аўкцыёне знізіўся да 12 млрд рублёў, але ахвотных іх выкупіць няма. Такая ж сітуацыя і на Слуцкім піўзаводзе.

Дарэчы, Маладзечанскі раён быў выбраны для правядзення нарады невыпадкова. Менавіта тут працуе нямала паспяховых і перспектыўных суб'ектаў малога і сярэдняга бізнесу.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# РОШЧЫНА З МАЛІТВАЙ



**У нядзелю ў Спаса-Еўфрасіннеўскім жаночым манастыры ў Полацку будзе мнагалюдна, а сёння тут цішыня і спакой, манахіні займаюцца сваімі паўсядзёнымі справамі: хтосьці прадае наведнікам манастыра свечкі і рэлігійную літаратуру, хтосьці мые вокны гаспадарчых памяшканняў, прыбірае тэрыторыю. Я чакаю сястру Вольгу. Сёння ў мяне незвычайны дзень — я буду пячы манастырскія пасхальныя кулічы.**

«Буду пячы» — сказана вельмі гучна. «Мне дазволілі паназіраць» — гэта больш дакладна. Разам з сястрой Вольгай ідзём да маленькага дамка-пякарні воддаль велічнага будынка Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра. Раз на год яна ажывае: сюды заносяць прадукты, і пякарня бярэ на сябе права называцца сапраўды святым месцам у манастыры. Яшчэ ў сенцах адчуваю прыемны пах рошчыны, разынак, ваніліну і толькі што выпечанай здобы. Унутры пякарні горача.

«Работа ў нас пачалася а 6 гадзіне раніцы. Матушка ігумення назвала сясцёр, якія сёння пойдуць у пякарню, — тлумачыць сястра Вольга. — Пячы кулічы — гэта святая справа, таму дазволіць яе можна не кожнай».

Раніцай жанчыны робяць першы замес цеста. Бліжэй да абеду — наступны.

— Глядзіце, яно ідэальнае; мяккае, эластычнае, не тлустае, — дэманструе мне ёмістасць з жоўценькім цестам сястра Вольга. — Часам мы нават ванілін не дадаем, бо хочацца захаваць натуральны смак куліча.

Цеста пакідаюць на некалькі гадзін, каб яно «падышло». Потым сёстры старанна раскладаюць яго па формах, даюць крыху пастаяць — і адпраўляюць у печ. Гадзіна — і стол застаўлены гарачымі кулічамі. Наперадзе апошняя і самая прыемная частка велікоднай выпечкі: упрыгожванне кулічоў. Калі папярэднія этапы сёстры робяць паасобку, то гэты — усе разам, абступіўшы стол з ужо астылымі булкамі. Румяную скарыначку кулічоў жанчыны заліваюць глазурай — яечнымі бялкамі, узбітымі з цукровай пудрай, — зверху булкі пасыпаюць мармеладам, здробненымі арэхамі, шакаладам, рознакаляровай цукровай пасыпкай.

За тры «рабочыя» дні ў Спаса-Еўфрасіннеўскім манастыры жанчыны выпекуць каля 1200 кулічоў. Ніводзін з іх не трапіць на прылавак крамы: здоба прызначана для саміх сясцёр і для віншаванняў.

Напрыканцы майго вандравання ў святую пякарню я папрасіла сястру Вольгу падзяліцца рэцэптам манастырскага куліча.

— Гэта сакрэт, які раскрываць нельга. Ён захоўваецца з даўніх часоў, перадаецца з пакалення ў пакаленне. Але нашыя кулічы сапраўды самыя смачныя, — са шчаслівай усмешкай на твары адказвае сястра Вольга.

**Любоў БЯЛЯЕВА, фота аўтара.**



*ЛІЧБА ДНЯ*

**на 40%**

***павялічылася за мінулы год колькасць плацежных тэрміналаў у рэспубліцы: па выніках 2013 года на 9,4 млн жыхароў прыпадала 11,8 млн плацежных картак. Сёння банкаўская плацежная картка з'яўляецца асноўным інструментам безнаяўнага разліку. Плацежная банкаўская картка ўжо перастала быць сродкам, з дапамогай якога можна толькі разлічыцца ў краме, аплаціць камунальныя паслугі і зняць наяўныя грошы ў банкамаце. Цяпер плацежная банкаўская картка дазваляе атрымаць доступ да шырокага набору зручных і простых электронных сэрвісаў, якія дазваляюць вырашаць цэлы спектр задач як у штодзённым жыцці, так і ў бізнесе.***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.04.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9950,00 | ▲ |
| Еўра | 13770,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 277,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 902,90 | ▲ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | +10° |
| Віцебск | +10° |
| Гомель | +12° |
| Гродна | +10° |
| Магілёў | +12° |
| Мінск | +12° |

# ВЕТЛІВАСЦЬ ПАМЕЖНІКА, УСМЕШКА МЫТНІКА

## ПАСПРЫЯЮЦЬ ПЕРШАМУ ЎРАЖАННЮ ПРА НАШУ КРАІНУ

**Аб гэтым, і не толькі, гаварылася ў Брэсце на нарадзе па падрыхтоўцы да чэмпіянату свету. Большасць замежных балельшчыкаў, якія будуць ехаць у Мінск з заходніх краін, мяжу перасячэ ў Брэсце. Некаторыя з іх наведаюць нашу краіну ўпершыню. І першае ўражанне аб краіне людзі атрымаюць яшчэ на пунктах памежнага пераходу, якія павінны быць цалкам гатовы да патоку турыстаў. Гэтыя пытанні ўсебакова абмяркавалі на нарадзе пад старшынствам намесніка старшыні Брэсцкага аблвыканкама Леаніда ЦУПРЫКА.**





У пунктах аўтадарожнага пропуску «Брэст», «Дамачава» і «Макраны» выдзелены і абазначаны асобныя палосы для руху аўтамабіляў балельшчыкаў і ўдзельнікаў чэмпіянату. **Начальнік службы пагранічнага кантролю Брэсцкай памежнай групы Ігар ДАЙЛІДЗЁНАК** сказаў, што ўсе супрацоўнікі мытні прайшлі адпаведную падрыхтоўку. Падпалкоўнік паабяцаў, што памежныя фармальнасці для аднаго аўтамабіля зоймуць 10-12 хвілін, а аўтобус яны разлічваюць праверыць і аформіць дзесьці за паўгадзіны. Дасягнутыя дамоўленасці з адпаведнымі ведамствамі Польшчы і Украіны аб садзейнічанні грамадзянам, якія будуць прыбываць на чэмпіянат свету. Калі з боку Украіны чакаюцца асобныя балельшчыкі, то з боку Польшчы іх будзе паток. Таму дапамагаць памежнікам і мытнікам будуць валанцёры з ліку студэнтаў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта, акрэдытацыя якіх падыходзіць да канца. Юнакі і дзяўчаты з веданнем замежных моў прыйдуць на дапамогу ў выпадку неабходнасці як нашаму службоўцу, так і замежнаму госцю.

Тут жа, на мяжы, кожнаму ахвотнаму будзе ўручана інфармацыйная літаратура. Спецыяльна да чэмпіянату свету ўпраўленнем спорту і турызму аблвыканкама разам з абласной газетай «Заря» зроблена «карта госця». Буклет змяшчае карту з указаннем па маршруце запраўак, пунктаў харчавання, іншых сацыяльных аб'ектаў на тэрыторыі вобласці паабапал трасы М1. Яшчэ на адной карце, якую атрымае турыст, «Славутасці Брэсцкай вобласці», адзначаны ўсе асноўныя помнікі гісторыі і культуры рэгіёна. Для гасцей падрыхтаваны адпаведныя электронныя матэрыялы.

Турыстычныя аб'екты, гасцініцы, аграсядзібы гатовы прыняць гасцей, калі ў запасе ў апошніх будзе некалькі дзён і яны пажадаюць лепш даведацца пра нашу краіну.

**Начальнік упраўлення гандлю і паслуг аблвыканкама Вадзім КРАЎЦОЎ** запэўніў прысутных, што па трасе Брэст — Мінск 22 аб'екты прыдарожнага сэрвісу адпавядаюць патрабаванням і намераны на час чэмпіянату арганізаваць работу ў кругласутачным рэжыме. Яны рады будуць пачаставаць гасцей стравамі беларускай кухні. Дзясятак гэтых страў дэгуставала і ўхваліла спецыяльная камісія ўпраўлення гандлю. А вось дзве кавярні, якія размяшчаліся побач з дарогай, будуць закрыты, бо яны не выканалі прадпісанняў па рамонце і добраўпарадкаванні тэрыторыі і паляпшэнні інтэр'еру. Намеснік губернатара таксама запатрабаваў, каб у кожнай кавярні на дарозе быў доступ у інтэрнэт.

На чыгуначным вакзале станцыі Брэст, які сустрэне пасажыраў поўнасцю абноўленым, для ўдзельнікаў чэмпіянату адведзена асобная білетная каса № 12. Яна адпаведным чынам аформлена, яе лёгка заўважыць па сімволіцы. Там працуюць падрыхтаваныя людзі. Таму афармленне білетаў павінна праходзіць без усялякіх затрымак, — паабяцаў прадстаўнік Беларускай чыгункі Валерый Герасімаў.

СТАР. 2

# МАЙСКАЕ НАДВОР'Е ПРЫЙДЗЕ Ў ВЫХАДНЫЯ

**Майскае надвор'е прыйдзе ў Беларусь у бліжэйшыя выхадныя, паведаміла карэспандэнту БЕЛТА галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Людміла Парашчук.**

Сёння антыцыклон перамесціцца на суседнія вобласці Расіі. На паўднёвы ўсход Беларусі з усходніх раёнаў Украіны пачне паступаць больш цёплае вільготнае паветра. Ноччу і раніцай месцамі згусціцца слабы туман. Паветра днём прагрэецца да плюс 11-16 градусаў, у паўднёвых раёнах — да 18.

Людміла Парашчук таксама адзначыла, што цёплае паветра прадоўжыць паступаць на тэрыторыю краіны і ў выхадныя. «Пры гэтым на большай частцы тэрыторыі Беларусі ападкаў не прагназуецца, толькі месцамі па поўдні пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 4-10 градусаў, днём чакаецца ад 14 да 21 са знакам плюс. «Крыху дыскамфорту дадасць парывісты вецер», — сказала прадстаўнік гідраметэацэнтра.

У пачатку наступнага тыдня цёплыя паветраныя масы ўсё яшчэ будуць уплываць на ўмовы надвор'я, але атмасферны ціск пачне падаць. У сувязі з гэтым месцамі чакаюцца кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### РАСІЯ ДАЛА МЕСЯЦ УКРАІНЕ НА АПЛАТУ ДОЎГУ ЗА ГАЗ

Расія яшчэ месяц гатовая чакаць аплаты па даўгах Украіны за газ, пасля чаго пяройдзе на сістэму авансавых плацяжоў. Пра гэта заявіў прэзідэнт РФ Уладзімір Пуцін учора падчас «прамой лініі» з грамадзянамі Расіі, перадаюць інфармагенцтвы. «Калі і за наступны месяц ніякіх плацяжоў не будзе, у адпаведнасці з кантрактам, пяройдзем на перадаплату, — сказаў Пуцін. — Гэта азначае, што Украіна павінна будзе нам заплаціць грошы за месяц наперад, і мы паставім ім роўна столькі, колькі яны заплацяць». Прэзідэнт РФ таксама паведаміў, што пераход на перадаплату газу Украіне можа прывесці да збояў паставак гэтага энерганосьбіта ў Еўропу.

### ЛІТВА ВЫЗНАЧЫЛАСЯ З УВЯДЗЕННЕМ ЕЎРА



Прыняўшы ўчора Закон аб увядзенні ў Літве еўра і суправаджальныя акты, Сейм стварыў прававую аснову для ўвядзення ў Літве агульнаеўрапейскай валюты. Нягледзячы на традыцыйныя дыскусіі па гэтым пытанні, Закон аб увядзенні еўра Сейм прыняў абсалютнай большасцю галасоў. За прагаласавалі 87 членаў Сейма, 7 былі супраць і 13 парламентарыяў устрымаліся.

### БОЛЬШ ЗА 100 ЧАЛАВЕК ЗНІКЛІ ПРЫ КРУШЭННІ ПАЎДНЁВАКАРЭЙСКАГА ПАРОМА

Пасажырскае судна «Севол», на борце якога знаходзілася 474 чалавекі, пацярпела крушэнне каля берагоў Паўднёвай Карэі. Каля 320 з 447 пасажыраў — школьнікі, якія ехалі на экскурсію па востраве Чэчжу. Выратавальная аперацыя праводзілася пры дапамозе суднаў і верталётаў паўднёвакарэйскай берагавой аховы. На момант падпісання нумара ў друк паведамлялася пра двух загінулых. Выратавана 368 пасажыраў, пошукі яшчэ 104 працягваліся. За час выратавальнай аперацыі паром цалкам пайшоў пад ваду. Трагедыя адбылася прыкладна за 100 кіламетраў ад берага. Паводле папярэдніх звестак, ва ўмовах моцнага туману судна налецела на падводную скалу.

ISSN 1990 - 763X

14072

9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ЧЫМ ПАВЯЧЭРАЦЬ, КАБ ЛЕПШ СПАЦЬ?



Кажуць, што ад бессані дапамагае цёплае малако, настой рамонку з мёдам, чарка бурбону і брэндзі. Washington Post даследавала пытанне з навуковага пункту гледжання. Для пачатку трэба выключыць з рацыёну ежу і напоі, якія перашкаджаюць заснуць, рэкамендуе Майкл Грэнднэр з Пенсільванскага ўніверсітэта. У прыватнасці, усе тыя, што змяшчаюць кафеін. Варта пазбягаць і спіртнога. Магчыма, яно палягчае засынанне, але сон будзе не вельмі глыбокім. Вучоны таксама раіць пазбягаць нікаціну, вялікіх порцый і вострых страў за вячэрай. Больш складаная сітуацыя з выбарам страў, якія дапамагаюць заснуць. Напрыклад, мяса індычкі змяшчае трыптафан — адну з «цаглінак» серактаніну. Але сератанін не толькі ўсыпляе, але і выконвае шэраг іншых функцый у мозгу. І каб трыптафан з індычкі прынёс эфект, трэба з'есці паўкіло індычыны за адзін прысест. Затое адрэгуляваць рытмы сну дапаможа ежа, багатая на мелатанін. Калі вы «сава», але вымушаны ўставаць а 7-й раніцы, ешце за вячэрай, напрыклад, вішні. Навукоўцы адзначаюць, што малыя дозы мелатаніна (1,5-3 мг) дзейнічаюць лепш, чым вялікія. Малако — крыніца кальцыю, арэхі і зерне — магнію, суп місо, рыба і ёгурт змяшчаюць вітаміны групы В. Усе гэтыя рэчывы таксама важныя для рэгулявання сну.

КОРАТКА

Беларускія банкі ў студзені-лютым скарацілі аб'ём крэдытавання на будаўніцтва і набыццё жылля на 36,1% да Br1,34 трлн у супастаўных цэнах у параўнанні з аналагічным перыядам 2013 года.

Сальда бягучага рахунку плацежнага балансу Беларусі па выніках студзеня 2014 года склалася адмоўным у памеры $336,9 млн супраць адмоўнага сальда на ўзроўні $729,5 млн у студзені 2013 года.

У сталіцы ў сакавіку па медыцынскую дапамогу з-за ўкусаў кляшчоў звярнуўся 51 чалавек.

Дзве гадзіны знаходжання ў аквапарку «Лебядзіны», які адкрыецца ў Мінску 1 мая, будуць каштаваць ад Br80 да Br120 тыс.

У Гомелі пасля начной пагоні па вуліцах п'яны кіроўца аўтамабіля «ВАЗ» спрабаваў уплаў уцячы ад супрацоўнікаў ДАІ. Аднак, праплыўшы ў возеры дзесяць метраў, хутчэй за ўсё, прыйшоў у сябе ад ледзяной вады і вярнуўся на бераг, дзе яго і чакалі інспектары.

■ Фестывалім!

# СЮРПРЫЗЫ «БАЗАРУ»

## Продаж білетаў распачынаецца!

**XXIII міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» сёлета здзівіць афармленнем галоўнай канцэртнай пляцоўкі (3D-абсталяванне, аквашоу з фантанамі, якія «спяваюць»), а таксама новымі праектамі ў праграме. Арганізатары «базару» сцвярджаюць, што адкрыццё фэсту па выкарыстанні сучасных тэхналогій будзе нейкім чынам нагадваць Алімпіяду ў Сочы. Білеты на канцэрты сёлета пачнуць прадаваць як ніколі рана — ужо на гэтым тыдні. Новы фармат конкурсу маладых выканаўцаў і іншыя змяненні, безумоўна, зробяць фестываль яшчэ больш цікавым.**





Фота БЕЛТА.

**Плакат фестываля ў руках мастака-дызайнера Дар'і ВОЛКАВАЙ.**

### Менш — не значыць горш

Афіцыйнае адкрыццё чарговага «базару» адбудзецца 10 ліпеня, а закрыецца фестываль — 14 ліпеня. У ім возьмуць удзел прадстаўнікі каля трыццаці краін свету.

— Калі казаць пра фармат «Славянскага базару», летась атрымалася ўдала: скарацілася колькасць дзён яго афіцыйнага правядзення: не 7–8 дзён, як калісьці, а толькі 5. Але гэта ніяк не паўплывала на інтарэс да фэсту, на насычанасць яго падзеямі, — расказвае **Уладзімір КАРАЧЭЎСКІ, першы намеснік міністра культуры Беларусі.**

Паводле яго слоў, па традыцыі, розныя канцэрты праводзяцца як перад, так і пасля заканчэння фэсту. У прыватнасці, сёлета першы канцэрт у Летнім амфітэатры — «Парад усмешак» з удзелам Клары Новікавай, Яфіма Шыфрына, братоў Панамарэнка і іншых — адбудзецца 8 ліпеня. А апошні — «Рок-панарама» з удзелам гурта «Чайф» — 16 ліпеня.

У канцэрце ганаровага адкрыцця возьмуць удзел такія «зоркі», як Філіп Кіркораў, Раймонд Паўлс, Стас Міхайлаў, Валерыя, Сяргей Юрскі, «Хор Турэцкага», Алёна Ланская, Анатоль Ярмоленка і ансамбль «Сябры» і іншыя (кошт квіткоў ад 600 тысяч да 1,3 мільёна рублёў).

— У афіцыйнай частцы цырымоніі адкрыцця штогод кіраўніком дзяржавы ўручаецца спецыяльная ўзнагарода «Праз мастацтва — да міру і ўзаемапаразумення». Сёлета лаўрэатам стане народны артыст СССР, кампазітар Раймонд Паўлс, — дадаў Уладзімір Карачэўскі. На «Алеі зорак» плануецца адкрыць імянную зорку маэстра.

СТАР. 6

## 17 ШМАТДЗЕТНЫХ ЖАНЧЫН УЗНАГАРОДЖАНЫ ОРДЭНАМ МАЦІ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка за нараджэнне і выхаванне пяці і больш дзяцей узнагародзіў 17 шматдзетных жанчын Гродзенскай вобласці і Мінска ордэнам Маці, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

Сярод удастоеных гэтай узнагароды сацыяльны работнік Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Іўеўскага раёна Алена Кузьміч, хатняя гаспадыня з г.п. Юрацішкі Таццяна Лобач, работніца ТАА «Вазсэрвіс-С» Марыя Абрамовіч, зборшчык абутку СЗАТ «Отыка» Іна Гук, медсястра мінскага клінічнага радзільнага дома № 2 Любоў Спірыдонава.

■ Міжнародны вектар

## УКРАІНЦЫ ХОЧУЦЬ У БЕЛАРУСЬ

У беларускае пасольства ў Кіеве паступае вялікая колькасць зваротаў і тэлефонных званкоў ад грамадзян, якія цікавяцца правіламі ўезду ў Рэспубліку Беларусь. Пра гэта, адказваючы на пытанні журналістаў, паведаміў **Дзмітрый МІРОНЧЫК, прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў нашай краіны.**

Па словах дыпламата, людзі пытаюць у тым ліку і пра тое, як пераехаць у Беларусь. «Як вядома, ва Украіне пражывае вялікая колькасць выхадцаў з Беларусі і грамадзян нашай краіны», — дадаў прадстаўнік МЗС. — Таму, магчыма, гэтыя людзі захочуць вярнуцца на радзіму».

## КАЛЕГІ ПА САДРУЖНАСЦІ

20-21 красавіка Беларусь з афіцыйным візітам наведае міністр замежных спраў Арменіі Эдвард Налбандзян. Па інфармацыі МЗС Беларусі, падчас візіту адбудзецца яго сустрэча з міністрам замежных спраў Беларусі Уладзімірам Макеем. «Бакі абмяркуюць увесь спектр двухбаковага парадку дня супрацоўніцтва, у тым ліку ў палітычнай, гандлёва-эканамічнай і гуманітарнай сферах, а таксама ўзгодняць узаемадзеянне ў міжнародных арганізацыях», — расказаў Дзмітрый Міронычык.

Па выніках перамоў у МЗС плануецца падпісанне плана кансультацый паміж міністэрствамі замежных спраў Беларусі і Арменіі на 2014—2015 гады.

Заўважым, што Беларусь з'яўляецца важным гандлёвым партнёрам Арменіі і займае па аб'ёме ўзаемнага гандлю трэцяе месца сярод краін СНД (пасля Расіі і Украіны). Разам з тым у гандлі Беларусі з краінамі Садружнасці Арменія пакуль што займае толькі дзясятае месца. Мы экспартуем у гэтую краіну шыны, грузавыя аўтамабілі, трактары, а Арменія прадае нам моцныя спіртныя напоі, нафтапрадукты, шкляную тару, лекі.

## НОВЫЯ РЫНКІ

На наступным тыдні запланаваны афіцыйны візіт у Беларусь міністра замежных спраў і супрацоўніцтва Рэспублікі Мазамбік Алдэміра Балоэ. Ён сустрэнецца з прадстаўнікамі ўрада нашай краіны. «Падчас перамоў будуць абмеркаваны перспектывы далейшага развіцця беларуска-мазамбікскага супрацоўніцтва ва ўсіх сферах, і перш за ўсё — у гандлёва-эканамічнай галіне», — удакладніў прэс-сакратар МЗС.

Нагадаем, у маі 2013 года адбыўся візіт у гэтую краіну Валянціна Рыбакова, намесніка міністра замежных спраў Беларусі. Тады прадстаўнік МЗС наведаў цырымонію адкрыцця пастаянна дзеючай выставы-продажу беларускай тэхнікі і абсталявання ў Мапуту, сталіцы Мазамбіка. Выстава была размешчана на плошчы сумеснага беларуска-мазамбікскага прадпрыемства BelAfrica Ltd. Мазамбік зацікаўлены ў супрацоўніцтве з нашай краінай у сферах вытворчасці прадуктаў харчавання, стварэнні сумесных прадпрыемстваў па зборцы беларускай тэхнікі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

■

# ВЕТЛІВАСЦЬ ПАМЕЖНІКА, УСМЕШКА МЫТНІКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Яшчэ адно цікавае пытанне ўзняў кіраўнік Брэсцкага ўпраўлення па спорце і турызме. Цягнікі, якія прыбываюць з-за мяжы, абавязкова стаяць у Брэсце дзве гадзіны, пакуль колы «адаптуюць» да шырыні нашай каляіны. За гэты час пасажыраў можна было б звазіць на экскурсію — напрыклад, у Брэсцкую крэпасць. І адпаведныя службы атрымалі ўказанне быць гатовымі да прадстаўлення такой паслугі, калі госці яе замовяць.

Леанід Цупрык пакрытыкаваў кіраўніцтва вакзала за тое, што падчас прыбыцця паяздоў, асабліва далёкага накіравання, на пероне не відаць насільшчыкаў. Бывае, гэта выклікае справядлівыя нараканні пасажыраў. І хоць чыгуначнікі заверылі, што служба насільшчыкаў на станцыі ёсць, кіраўніцтва вакзала атрымала ўказанне актывізаваць работу гэтай службы. Насільшчык павінен быць на пероне, а не сядзець недзе ўбаку і чакаць, пакуль яго паклічуць.

Падчас абмеркавання падрыхтоўкі да чэмпіянату і транзіту гасцей узнікла, на першы погляд, нечаканае пытанне. Напрыклад, прыехаў чалавек з-за мяжы, гуляе дзве гадзіны па ваколіцах новага рэканструяванага вакзала, дзе прыбіральні платныя. А ў госця наяўных нашых грошай няма. Тэрміналы для аплаты карткай у прыбіральнях не ўстаноўлены. Што рабіць? Прадстаўнік цэнтра гігіены і эпідэміялогіі агучыла прэтэнзіі да санітарнага стану прыбіральняў на пункце памежнага пропуску «Брэст». Усе гэтыя праблемы запатрабавана вырашыць за будучыя тыдзень-паўтара. Намеснік губернатара сказаў, што ў справе падрыхтоўкі да транзіту гасцей праз нашу вобласць дробязяў няма. Таму што любая дробязь можа сапсаваць агульную карціну станоўчых уражанняў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

■ Абітурыент—2014

# З ВІДЭАЎРОКАЎ... У ЭЛЕКТРОННЫ КАБІНЕТ

**Новыя дыстанцыйныя ўмовы для навучання і падрыхтоўкі да ЦТ з'явіліся ў вучняў сталічнага ліцэя № 1: днямі Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі адкрыў на яго базе кабінет відэаканферэнц-сувязі.**



Ліцэй №1 і БДУІР звязвае шматгадовае супрацоўніцтва: менавіта тут навучаюцца патэнцыяльныя абітурыенты БДУІР. І адкрыццё кабінета відэаканферэнц-сувязі — гэта выхад на новы ўзровень узаемадзеяння.

Выкладчыкі БДУІР будуць праводзіць дыстанцыйна для ліцэістаў заняткі па фізіцы, матэматыцы і інфарматыцы, прычым абсалютна бясплатна. У навучэнцаў з'явіцца магчымасць больш паглыбленага вывучэння прадметаў. Яны змогуць кантактаваць з выкладчыкамі ўніверсітэта, а тыя будуць адказваць на пытанні ліцэістаў у рэжыме рэальнага часу.

Памяшканне аснашчана сучасным абсталяваннем, якое не запатрабуе мадэрнізацыі ў бліжэйшыя гады. Абсталяванне дазваляе атрымаць дакладную выяву і чысты гук. На яго закупку ўніверсітэт выдаткаваў каля 65 мільёнаў беларускіх рублёў. Дзякуючы новым тэхналогіям у ліцэістаў будзе таксама магчымасць паўдзельнічаць у семінарах, трэнінгах і алімпіядах, якія арганізуе ВНУ.

БДУІР традыцыйна выступае піянерам ва ўкараненні новых тэхналогій і рашэнняў у сферы адукацыі. І сваіх абітурыентаў сёлета ён будзе сустракаць па-новаму. Падчас уступнай кампаніі абітурыенты БДУІР змогуць падаваць заяву для паступлення па электроннай пошце. На сайце ўніверсітэта будучы студэнт зможа стварыць персанальны электронны кабінет, уваход у які магчымы толькі па персанальных пашпартных даных. У кабінеце трэба будзе размясціць інфармацыю пра сябе і ўказаць пералік спецыяльнасцяў у парадку расстаноўкі прыярытэтаў. Паколькі цяпер абітурыент зможа ўказваць усе 34 спецыяльнасці тэхніка-тэхналагічнага профілю (у парадку ўбывання прыярытэтаў), то складанне спіса пры звычайным спосабе падачы заявы займала б шмат часу. А дома, у спакойных абставінах, абітурыенту працсей будзе вызначыцца з выбарам.

Калі заява будзе разгледжана, абітурыента выклічуць у прыёмную камісію для прад'яўлення ўсіх неабходных дакументаў: атэстата, сертыфікатаў ЦТ і медыцынскай даведкі. Асабістага наведвання прыёмнай камісіі электронная форма запаўнення заявы не выключае.

Яшчэ адна навінка будучай прыёмнай кампаніі — адкрыццё набору па трох новых спецыяльнасцях. На факультэце камп'ютарнага праектавання будзе ажыццяўляцца набор на спецыяльнасць «Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі ў бізнес-менеджменце». Сёння на рынку працы вельмі запатрабаваны спецыялісты, якія валодаюць інфармацыйнымі сістэмамі і тэхналогіямі і ў той жа час здольныя прымаць аптымальныя рашэнні ў кіраванні бізнесам. Абітурыентам будзе прадастаўлена 15 бюджэтных месцаў і 45 платных на дзённай форме навучання, а таксама 30 месцаў — на дыстанцыйнай форме навучання. Выпускнікі атрымаюць кваліфікацыю «Праграміст. Бізнес-аналітык».

На кафедры электроннай тэхнікі і тэхналогій адкрываюцца дзве новыя спецыяльнасці: «Праектаванне і вытворчасць праграмна-кіруемых электронных сродкаў» і «Праграмна-кіруемыя электронна-аптычныя сістэмы». Гэта шматпрофільныя спецыяльнасці, звязаныя з камп'ютарным праектаваннем сучасных складаных сістэм.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■

## ІНТЭГРАЦЫЙНЫ ХАРАКТАР ДЫПЛАМАТЫІ ГАРАДОЎ

**У Пасольстве Расійскай Федэрацыі ў Мінску адбылася прэзентацыя кнігі «Беларусь — Расія: дыпламатыя гарадоў». Яна была выдадзена ў рамках сумеснага інфармацыйна-інтэграцыйнага праекта.**

Аснову кнігі склалі публікацыі на тэму далейшага паглыблення ўзаемадзеяння дзвюх краін літаральна ва ўсіх сферах дзейнасці, у тым ліку і ў эканоміцы. Гэтае выданне ў пэўнай ступені прымеркавана да маючай сёлета адбыцца сустрэчы прадстаўнікоў пародненых гарадоў Беларусі і Расіі. Старшыня праўлення Беларускай грамадскай арганізацыі «Пародненыя гарады» Барыс Батура адзначыў у час прэзентацыі, што гэтая сустрэча абавязкова адбудзецца і стане значным унёскам грамадскасці дзвюх краін у развіццё стасункаў жыхароў дзясяткаў беларускіх і расійскіх гарадоў. Бо без садзейнічання ўсямернаму развіццю руху гарадоў-пабрацімаў немагчыма ўвогуле разлічваць на поспех інтэграцыйных працэсаў.

На думку пасла Расійскай Федэрацыі Аляксандра Сурыкава, міжрэгіянальнае супрацоўніцтва паміж Расіяй і Беларуссю мае выразна выяўлены інтэграцыйны характар і з'яўляецца адным з важнейшых інструментаў для павышэння канкурэнтаздольнасці нашых эканомік.

Нагадаем, пародненыя гарады (ці гарады-пабрацімы) — гэта гарады, паміж якімі наладжаны пастаянныя (без вызначэння тэрміну дзеяння) дружалюбныя сувязі для супрацоўніцтва і ўзаемадапамогі ў інтарэсах умацавання даверу ўзаемаразумення і дружбы паміж народамі.

**Леанід ТУГАРЫН.**

## ПРА ПАРКОЎКІ ВАРТА ПАДУМАЦЬ ЗАГАДЗЯ

**Кожнаму раёну Мінска трэба прапрацаваць пытанне стварэння платных паркавак і дарог. Такое даручэнне мэр сталіцы Мікалай ЛАДУЦЬКА даў на пасяджэнні камісіі па забеспячэнні бяспекі дарожнага руху пры Мінгарвыканкаме, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Перад Мінскам стаіць сур'ёзная задача павышэння якасці дарожнага руху на тэрыторыі горада з улікам таго, што ў 2013 годзе яго насельніцтва павялічылася на 20 тысяч, а машын стала больш на 15 тысяч. Праз 10 гадоў аўтамабіляў у Мінску будзе яшчэ на 100 тысяч больш, і да гэтага трэба рыхтавацца сёння. Кожнаму раёну варта прапрацаваць пытанне па стварэнні платных паркавак і дарог. Трэба таксама вывучыць пытанне аб тым, як зрабіць платнымі 10 км першага гарадскога транспартнага кола», — сказаў Мікалай Ладуцька.

Мэр горада даручыў упраўленням юстыцыі і гарадской гаспадаркі і энергетыкі забяспечыць ўзгадненне рашэння Мінгарвыканкама па будаўніцтве паркавачных месцаў у Мінску, якое было аспрэчана пракуратурай сталіцы з-за працэдурных пытанняў. «У Мінску трэба прынцыпова вырашыць пытанне па развіцці паркавачных месцаў. Работу па будаўніцтве паркавак можна адхіліць, але тады аўтамабілі будуць стаяць на зялёнай зоне», — падкрэсліў Мікалай Ладуцька.

У праграму праектавання і будаўніцтва аб'ектаў транспартнай структуры Мінска на 2014 год увайшло 12 аб'ектаў вулічна-дарожнай сеткі з агульнай сумай выдаткаў 240 млрд рублёў. Сёлета ў Мінску вядуцца работы па рэканструкцыі вуліц Каліноўскага, Скрыганава, Алібегава, трох участкаў праспекта Дзяржынскага, будаўніцтве пад'езду да амбасады Ірана ў Беларусі, рэканструкцыі вуліц Ціміразева, Сапёраў, дзвюх вуліц у раёне Нацыянальнай бібліятэкі, будаўніцтва транспартнай развязкі на скрыжаванні праспекта Незалежнасці з вуліцай Філімонава.

# ПРАВАПАРАДАК У МЕТРО — ПАД КРУГЛАСУТАЧНЫМ КАНТРОЛЕМ

**Падчас сусветнага хакейнага чэмпіянату аб'екты метрапалітэна стануць зонай павялічанай наведвальнасці, пасажырапаток значна павялічыцца. Як будзе забяспечвацца бяспека сталічнай падземкі?**

Па інфармацыі **прэс-афіцэра УУС па ахове Мінскага метрапалітэна Кацярыны ВЯРШЫЦКАЙ,** асабовы склад гатовы да ўзмоцненага варыянту нясення службы. Стан правапарадку будзе знаходзіцца пад кругласутачным кантролем. Для павышэння камунікатыўных навыкаў супрацоўнікі УУС прайшлі лінгвістычную падрыхтоўку, атрымаўшы неабходныя веды для зносін з замежнымі гасцямі на замежнай мове. Акрамя таго, кожны супрацоўнік прайшоў і адпаведную агульную псіхалагічную падрыхтоўку.

Служба бяспекі Мінскага метрапалітэна таксама гатова забяспечыць парадак падчас чэмпіянату свету па хакеі. Свае асноўныя задачы служба выконвае разам з супрацоўнікамі УУС па ахове Мінскага метрапалітэна.

Для забеспячэння кантрольна-прапускнога рэжыму на пяці станцыях створаны спецыяльныя зоны агляду. Для гэтага ўсталяваны металадэтэктары ў выглядзе рамкі і сканер (да 2015 года плануецца стварыць такія зоны на ўсіх станцыях). Для кантролю бяспекі ў многіх вагонах устаноўлены камеры відэаназірання. Больш за 1 тысячу відэакамер устаноўлена на аб'ектах метрапалітэна, яшчэ столькі ж плануецца паставіць у бліжэйшы час.

Рыхтуецца да хакейнага першынства і кожны супрацоўнік службы бяспекі. Больш за 100 чалавек з ліку работнікаў зараз знаходзяцца на павышэнні кваліфікацыі ў Цэнтры павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў МУС Рэспублікі Беларусь. На станцыі з двума вестыбюлямі будуць дзяжурыць тры інспектары. Супрацоўнікі службы бяспекі будуць кругласутачна патруляваць платформы, вестыбюлі і падземныя праходы метрапалітэна.

Сёння аб'екты метро знаходзяцца пад аховай не толькі супрацоўнікаў міліцыі, але добраахвотных дружын. У склад атрада Мінскага метрапалітэна ўваходзіць больш за 100 чалавек з ліку супрацоўнікаў метро, і каля 50 чалавек складаюць дружыны БРСМ — студэнты сталічных ВНУ.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Палітычная пятніца з Аляксандрам Шпакоўскім



# СТАЎКА НА РЭГІЁНЫ

**Напярэдадні падпісання дагавора аб утварэнні Еўразійскага эканамічнага саюза ўсё большую цікавасць уяўляюць прамыслова-гандлёвыя стасункі паміж дзяржавамі «мытнай тройкі» і аналіз рэальных магчымасцяў для паляпшэння супрацоўніцтва.**

### ПАТЭНЦЫЯЛ РЭГІЁНАЎ

Пры гэтым пытанні стратэгічнага характару, кшталту ліквідацыі выключэнняў і абмежаванняў у сістэме адзінай эканамічнай прасторы, стварэння буйных індустрыяльных холдынгаў, арганізацыі ваенна-прамысловай кааперацыі і інш., могуць і павінны рэгулявацца на міжурадавым узроўні, але шэраг іншых аспектаў адназначна павінен быць аднесены да кампетэнцыі рэгіёнаў. У такіх абставінах набываюць надзвычайную важнасць стасункі паміж мясцовымі ўладамі гарадоў і раёнаў, адносіны на ўзроўні адміністрацыі асобных прадпрыемстваў.

Такія паняцці, як «дыпламатыя гарадоў», «рэгіянальная інтэграцыя», «рух пабрацімства», ва ўмовах стварэння еўразійскага праекта стануць больш актуальнымі. Безумоўна, будучы Еўразійскі саюз пройдзе тым шляхам, якім ужо крочыў праект Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі, а сама Саюзная дзяржава павінна выпрацаваць новыя формы інтэграцыі, каб стаць прыкладам і эксперыментальнай пляцоўкай для еўразійскага збліжэння. Існуе неабходнасць будучай сур'ёзнай працы дыпламатаў і заканадаўцаў для таго, каб «падцягнуць» казахстанскіх партнёраў і іншых патэнцыяльных удзельнікаў еўразійскай ініцыятывы да ўзроўню ўжо існуючага беларуска-расійскага супрацоўніцтва. Аднак вынік гэтай работы напрамую залежыць не толькі ад нарматворчай і дыпламатычнай актыўнасці, але і ад плёну практычнага прымянення новых нормаў і правілаў.

Напрыклад, у межах Саюзнай дзяржавы падпісана больш за дзвесце дамоўленасцяў, пратаколаў, мемарандумаў, што рэгулююць двухбаковыя адносіны, а ў адной толькі Маскоўскай вобласці налічваецца каля 60 гарадоў, у якіх ёсць партнёры і пабрацімы на тэрыторыі Беларусі. Аднак якое якаснае вымярэнне маюць гэтыя дагаворы ў супрацоўніцтве рэгіёнаў? На думку Пасла Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Аляксандра Сурыкава, «патэнцыял для такога ўзаемадзеяння яшчэ далёка не рэалізаваны».

### ПАЗІТЫЎНЫЯ ВЫНІКІ — ПАКУЛЬ ЗАСЛУГА ДЗЯРЖАВЫ

Тым не менш ужо дасягнутыя вынікі з'яўляюцца дастаткова высокімі, што яшчэ раз падкрэслівае неабходнасць далейшай увагі гэтаму кірунку. Сёння Беларусь — адзін з асноўных гандлёва-эканамічных партнёраў Расіі, і па выніках 2013 года тавараабарот між дзяржавамі склаў $39,72 млрд, пры гэтым беларускі экспарт — $16,83 млрд з ростам экспартных паказчыкаў на $520 млн да ўзроўню 2012 года. Такі вынік невялікай, у параўнанні з Расіяй, Рэспублікі Беларусь цалкам абвяргае заключэнні рознага кшталту «крытыкаў», што заяўляюць аб нібыта «несумяшчальнасці і несуадноснасці беларускай і расійскай эканомік» і па гэтай прычыне прапануюць ці то ўвогуле адмовіцца ад праектаў саюзнай інтэграцыі, ці то згадзіцца на загадзя нераўнапраўныя ўмовы прыняцця рашэнняў.

Між тым відавочна, што львіная доля такіх пазітыўных вынікаў пакуль усё ж адносіцца не да эфекту міжрэгіянальнага супрацоўніцтва адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, а да развіцця сувязяў непасрэдна паміж Рэспублікай Беларусь і асобнымі расійскімі суб'ектамі. Нарматыўную базу міжрэгіянальных стасункаў Беларусі і Расіі складаюць 64 дагаворы аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным і культурным супрацоўніцтве, што ахопліваюць 60 расійскіх рэгіёнаў. Большасць з гэтых пагадненняў (47 дакументаў) заключана беларускім бокам ад імя ўрада. Для вырашэння практычных пытанняў гандлёва-эканамічных задач на тэрыторыі РФ створана сетка з 11 аддзяленняў Пасольства Рэспублікі Беларусь у рэгіёнах Расіі. Падобная дзяржаўная прысутнасць цалкам зразумелая з улікам спецыфікі беларускай эканомікі, дзе каля 70% дабаўленай вартасці прыходзіцца на дзяржсектар.

**Такія адносіны прамысловай кааперацыі даюць падставу казаць аб контурах узнікнення транснацыянальных карпарацый з прыцягненнем магчымасцяў і капіталу Беларусі, Расіі і Казахстана.**

Эканамічная лінія Беларусі ў Расіі з'яўляецца дастаткова эфектыўнай: у 2013 годзе Беларусь мела адносіны ўзаемнага гандлю з усімі 80 рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі, з характэрным для большасці выпадкаў ростам асноўных гандлёва-эканамічных паказчыкаў. Асноўнымі партнёрамі нашай краіны сталі Масква, Санкт-Пецярбург, Татарстан, Башкартастан, Удмурція, Пермскі край, а таксама Бранская, Маскоўская, Смаленская і Цюменская вобласці.

### «КУПІ-ПРАДАЙ» — БОЛЬШ НЕ АСНОВА МІЖРЭГІЯНАЛЬНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА

Але не толькі гандлёвыя паказчыкі прымаюцца за аснову міжрэгіянальнага супрацоўніцтва. На першы план усё больш выходзяць сумесныя прамысловыя праекты на аснове кааперацыі беларускіх і расійскіх вытворцаў. Як слушна адзначыў кіраўнік аддзела Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі ў Смаленску Мікалай Куцко, «адносіны паміж рэгіёнамі даўно не будуюцца на прынцыпе «купі-прадай». Напрыклад, Смаленскі завод халадзільнікаў разам з беларускім МЗХ «Атлант» выпускае ўжо больш за 200000 халадзільнікаў штогод, а створанае ў Смаленску сумеснае прадпрыемства за тры гады сабрала больш за 7 тысяч трактароў МТЗ. «Дачка» «Гомсельмаша» ў горадзе Бранску мае вытворчасць аб'ёмам каля 2000 камбайнаў штогод, рэалізуе прадукцыю ў 60 рэгіёнаў РФ і атрымлівае камплектуючыя з больш чым 60 расійскіх прадпрыемстваў. Такія адносіны прамысловай кааперацыі ва ўмовах стварэння адзінай эканамічнай прасторы даюць падставу казаць не толькі аб інтарэсах непасрэдна беларускіх вытворцаў, але аб контурах узнікнення транснацыянальных карпарацый з прыцягненнем магчымасцяў і капіталу Беларусі, Расіі і Казахстана. Менавіта такія ТНК у розных галінах эканомікі павінны стаць асновай развіцця Еўразійскага эканамічнага саюза, для чаго яшчэ больш мэтазгоднай выглядае актывізацыя міжрэгіянальных сувязяў.

### РЭГІЯНАЛЬНАЯ ПЕРСПЕКТЫВА

Маючы добрыя вынікі на ўзроўні дзяржавы, Беларусь павінна актыўней развіваць кантакты з партнёрамі на мясцовым узроўні, у тым ліку ў сферы прыватнага сектара, дзейнасць якога не павінна зводзіцца выключна да спекуляцыйных адносін. Такія галіны, як лёгкая прамысловасць, перапрацоўка сельскагаспадарчай прадукцыі, вытворчасць будаўнічых матэрыялаў, не могуць быць прадметам міжурадавага рэгулявання, аднак маюць важнае значэнне ў фармаванні побыту і складаюць індустрыяльны вобраз любой дзяржавы. У гэтым кірунку для «дыпламатыі гарадоў», працы міжрэгіянальных бізнес-асацыяцый і дзелавых саветаў застаецца шырокае поле магчымасцяў, якое патрэбна асвоіць з найбольшай карысцю

■

**«Прамая лінія»**

## ДА ЎВАГІ ПАЛЯЎНІЧЫХ І РЫБАЛОВАЎ!

26 чэрвеня ўступае ў сілу новая рэдакцыя правілаў вядзення палявання і рыбалоўства. Ці можна цяпер будзе зарэгістраваць паляўнічага сабаку без радаслоўнай? Якія дакументы патрэбны, каб займацца такімі папулярнымі відамі рыбалкі, як тролінг і падводнае паляванне? Якія перавагі дае членства ў Беларускім таварыстве паляўнічых і рыбаловаў? Дзе і як максімальна выгадна набыць пуцёўкі на здабычу звера ці лоў рыбы? На гэтыя і іншыя пытанні падчас «прамой лініі» адкажа **старшыня Рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў» Юрый Іванавіч ШУМСКІ.** Задаць пытанні можна **22 красавіка з 12.00 да 13.00 гадзін** па тэлефонах: **8 017 287 18 66, 8 017 287 18 71.** Папярэднія пытанні можна пакінуць, патэлефанаваўшы па нумары 8 017 287 18 72.

■ Факт

## У МІНСКУ АДКЛЮЧАЮЦЬ АЦЯПЛЕННЕ Ў ЖЫЛЫМ СЕКТАРЫ

**Адначасова з жылымі дамамі батарэі астынуць у гасцініцах, навучальных установах, дзіцячых садках, школах, інтэрнатах, бальніцах, іншых медыцынскіх і сацыяльных установах, а таксама ў музеях, бібліятэках, дзяржаўных архівах.**

Як паведаміў **начальнік упраўлення гарадской гаспадаркі і энергетыкі Мінгарвыканкама Дзмітрый ЯНЧЫК**, згодна з правіламі адключэнне ацяплення адбываецца, калі на працягу трох дзён сярэднясутачная тэмпература роўная плюс 8 градусам. У Мінску ўжо ўстойлівая плюсавая тэмпература, а на выхадных прагназуецца да 20 градусаў цяпла. Таму ўчора старшынёй Мінгарвыканкама было падпісана распараджэнне аб адключэнні ацяплення ва ўсіх катэгорый спажыўцоў. Да панядзелка падача цяпла ў Мінску будзе спынена.

**Святлана БУСЬКО.**

## «ВЯЛІКДЗЕНЬ. КРЫНІЦА РАДАСЦІ»

**Выстава пад такой назвай, прысвечаная розным аспектам свята Вялікадня, адкрылася ў Гродзенскім дзяржаўным музеі гісторыі рэлігіі.**

У экспазіцыі прадстаўлены рарытэтныя культавыя прадметы (богаслужэбныя кнігі, іконы), гравюры, велікодныя сувеніры, лялькі, паштоўкі, формы для выпечкі... І, безумоўна, велікодныя яйкі, выраблены ў XIX-XX стст. — каля 200 штук з розных матэрыялаў, а таксама нашы традыцыйныя пісанкі. Выстава будзе працаваць да 25 мая.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## ДА МОГІЛАК ПОЙДЗЕ БОЛЬШ АЎТОБУСАЎ

**У сувязі з масавым наведваннем могілак 19-20 і 26-29 красавіка будзе павялічана колькасць аўтобусаў на гэтых напрамках.**

Гаворка пра маршруты №№ 5Э «ДС «Чыжоўка» — Могілкі «Міханавічы», 68 «ДС «Карастаянавай» — Паўночныя могілкі», 94С «АС «Аўтазаводская» — Чыжоўскія могілкі» 109 «ДС Карбышава» — Паўночныя могілкі», 170Э «ДС «Захад-3» — Заходнія могілкі», 172Э «АВ «Маскоўскі» — Каладзішчанскія могілкі».

Паводле інфармацыі дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс», 19-20 і 26-29 красавіка будзе арганізавана работа часовых прыгарадных аўтобусных маршрутаў №№ 402Д «АС «Паўднёва-Заходняя» — Заходнія могілкі», 275Д «ДС «Славінскага» — Каралёў Стан», а 26-27 і 29 красавіка — экспрэснага аўтобуснага маршрута № 135Э «ДС «Захад-3» — Паўночныя могілкі».

29 красавіка пасажыраў будуць абслугоўваць часовыя аўтобусныя маршруты №№ 22Д «ДС «Чыжоўка» — Ст.м. «Аўтазаводская», 68С «ДС «Карастаянавай» — Паўночныя могілкі», 109С «ДС «Карбышава» — Паўночныя могілкі», 167 «1-я брама» — «2-я брама», 171Э «ДС «Захад-3» — Могілкі «Міханавічы», 174Э «Кульман» — Паўночныя могілкі», 337Д «Аг. Лясны — Бальшавік», 1568-ТК «Кульман — Паўночныя могілкі».

## КАЛЯ ХРАМАЎ ВЫДЗЕЛЯЦЬ МЕСЦЫ

**Дадатковыя паркавачныя месцы каля галоўных праваслаўных і каталіцкіх храмаў будуць выдзелены ў сталіцы ў нядзелю, 20 красавіка, калі будзе адзначацца Вялікдзень.**

Дзяржаўтаінспекцыя ў гэты дзень узмоцніць кантроль за захаваннем правілаў дарожнага руху і бяспекай на дарогах. Асаблівую ўвагу інспектары ДАІ нададуць праезду пешаходных пераходаў і скрыжаванняў, захаванню правілаў паркоўкі і стаянкі, хуткаснага рэжыму. Каб не ствараць нязручнасцяў, не плануецца ніякіх абмежаванняў дарожнага руху або перакрыцця вуліц.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## МАТЭМАТЫКА — НЕ ДЛЯ ДЗЯЎЧАТ?

**Два бронзавыя і адзін сярэбраны медалі заваявалі на Еўрапейскай матэматычнай алімпіядзе сярод дзяўчат беларускія школьніцы.**

Уладальніцай сярэбранай узнагароды стала вучаніца сярэдняй школы № 30 г.Гомеля Дар'я Рабцава. «Бронза» — у адзінаццацікласніцы Ліцэя БДУ Варвары Кузьміцкай і прадстаўніцы сталічнай гімназіі № 41 Ірыны Бурак.

Алімпіяда хоць і называецца еўрапейскай, але геаграфія яе ўдзельнікаў не абмяжоўваецца тэрыторыяй Еўропы. У гэтым годзе матэматычныя здольнасці на European Girls' Mathematical Olympiad прадэманстравалі каманды з 29 краін свету: Фінляндыі, Францыі, Італіі, Вялікабрытаніі, Галандыі, Швецыі, Швейцарыі, Польшчы, Мексікі, Японіі, ЗША і іншых.

Першая Еўрапейская матэматычная алімпіяда сярод дзяўчат прайшла ў 2012 годзе ў Кембрыджы (Вялікабрытанія). Беларусь у гэтым міжнародным турніры ўдзельнічала ў другі раз. Летась у Люксембургу наша каманда заняла першае месца, вярнуўшыся з трыма залатымі і адной сярэбранай узнагародай. Між іншым, у наступным годзе месцам для еўрапейскіх матэматычных баталій абрана Беларусь.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Калектыў Інстытута журналістыкі БДУ глыбока смуткуе з прычыны смерці дацэнта кафедры тэлебачання і радыёвяшчання ВАШКЕВІЧА Віталя Рамуальдавіча і выказвае шчырыя спачуванні яго блізкім і родным.**

**Калектыў РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні блізкім і родным дацэнта кафедры тэлебачання і радыёвяшчання ВАШКЕВІЧА Віталя Рамуальдавіча з прычыны яго смерці.**


## ДОПОЛНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ,

*опубликованной 01 апреля 2014 года в газете «ЗВЯЗДА»*

**по объекту «Группа многоквартирных жилых домов по генплану № 11, 12, 13 в микрорайоне № 1 реконструируемой застройки в границах ул. Шаранговича, Горецкого, Рафиева (бывшая дер. Сухарево)»**

**ООО «АРТЕС-СТРОЙИНВЕСТ»** информирует о **дополнении** к проектной декларации объекта долевого строительства, опубликованной в газете «ЗВЯЗДА» 01 апреля 2014 года:

***Для заключения договоров долевого строительства с гражданами, не состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, дополнительно предоставляются*** *в* жилом доме № 13 по генплану следующие квартиры:

- 4 (четыре) однокомнатные квартиры со строительными номерами №№ 353, 355, 382, 383 в дополнение к пункту а) проектной декларации по ранее опубликованным условиям и ценам;

- 6 (шесть) двухкомнатных квартир со строительными номерами №№ 228, 230, 233, 235, 298, 339 в дополнение к пункту б) проектной декларации по ранее опубликованным условиям и ценам;

- 3 (три) трехкомнатные квартиры со строительными номерами №№ 246, 212, 247 в дополнение к пункту в) проектной декларации по ранее опубликованным условиям и ценам.

**Информацию об объекте долевого строительства**, планировках квартир и условиях заключения договоров можно получить у Застройщика по телефону 8 (017) 3060611 или в риэлтерской организации ООО «ДИНАС» (сайт **www.dinas.by**, тел. 8 (017) 2339610).

УНП 191024785

## ИЗВЕЩЕНИЕ

**Государственное производственное объединение «Минскстрой»** доводит до сведения дольщиков о внесении изменений в проектную декларацию о строительстве нежилых помещений объекта «Жилой дом № 5 (по генплану) со встроенными помещениями по пр. Независимости в микрорайоне Уручье-3» в г. Минске, опубликованную в газете «Звязда» 5 декабря 2013 года:

Ожидаемый ввод нежилого помещения (дебаркадера) в эксплуатацию — май 2014 г.

Стоимость строительства 1 кв. метра площади нежилого помещения (дебаркадера) без учета выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет — 4 727 050 руб.

Заявления о долевом строительстве будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящих изменений в проектную декларацию в кабинете 105 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13 А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

*Генеральный директор Н.В. Милошевский УНП 100071325.*

**Утерянный страховой полис ЗСАО «Белингострах»** добровольного страхования наземных транспортных средств граждан формы 2РН серии БИ № 0011829 **считать недействительным**.

УНП 100219645

Кацярына ЗАБАЎСКАЯ:

TV@R

# «ПРАЦА НЕ АБДЫМЕ І НЕ СУПАКОІЦЬ»,

## або Чым вымяраецца поспех сучаснай жанчыны

**«Мінск 24 ДОК» — малады тэлеканал, дзе можна знайсці як дакументальнае кіно, так і шматсерыйныя спецыяльныя праекты. З ліку такіх ток-шоу «Давайце разбярэмся», дзе па аўторках і чацвяргах разам з прадстаўнікамі гарадскіх улад абмяркоўваюцца рэальныя праблемы сталіцы. Яго вядучая Кацярына Забаўская заўсёды ўпэўненая ў сваіх сілах. Яна лічыць сумным расклад, калі «жаданні супадаюць з магчымасцямі», і не губляе веры ў лепшыя якасці людзей. Пры сустрэчы Кацярына расказала аб працоўных буднях, пра жаночую паспяховасць і карысныя захапленні.**



***— Як гэта — працаваць у вострай сацыяльнай праграме?***

— Для мяне праца ў гэтым ток-шоу нічым не адрозніваецца ад іншых праектаў: прынцыпы ж усюды аднолькавыя. Хіба што з гасцямі праграмы перад запісам даводзіцца гутарыць даўжэй. Фармат перадачы даволі жорсткі, і вядучым трэба яго прытрымлівацца. Акрамя таго, чым больш вострая гутарка, тым большая зацікаўленасць у ёй. Мы адлюстроўваем рэчаіснасць, і калі з'яўляюцца крытычныя пытанні, то ні ў якім разе не замоўчваем іх, а высвятляем.

***— Ці лёгка ідуць на кантакт чыноўнікі ў абмеркаванні праблемных пытанняў?***

— У студыю прыходзяць пераважна дыпламатычныя суразмоўцы, якія разумеюць, што праблемы ў нас ёсць, і гавораць пра іх адкрыта. Тады дыялог складваецца лёгка. Але здараецца ўсякае. Бывалі выпадкі, калі рэжысёр спыняў запіс і мы размаўлялі з госцем «за кадрам», а потым зноў аднаўлялі працу ў рамках эфіру.

**Пры жаданні нешта змяніць — дзейнічайце! Часам не варта раздумваць доўга, бо ў сумненнях можа прайсці ўсё жыццё...**

***— Якія ўражанні ад гасцей застаюцца «за кадрам»?***

— Многія з іх маюць цудоўнае пачуццё гумару. У грымёрцы пастаянна чуецца смех, калі яны распавядаюць «гісторыі з жыцця». Бывае, нават падчас запісу праграмы так іранічна адкажуць на нейкае пытанне, што я смяюся да слёз. Даводзіцца выклікаць грымёра і спыняць працэс. Праца зацягваецца, але ж не магу стрымаць эмоцый.

***— Як рэагуюць гарадскія ўлады на пытанні, што ўздымае ток-шоу «Давайце разбярэмся»?***

— Ведаеце, гэты бок асабліва не афішуецца, але нярэдка я бачу перамены пасля выхаду ў эфір чарговага выпуску праграмы. Напрыклад, з'яўляецца асфальт на разбітай дарозе, пра якую мы здымалі сюжэт, або ўносяцца змены ў расклад руху аўтобусаў на праблемных маршрутах — транспарт пачынае хадзіць часцей. І ведаеце, прыемна бачыць такія зрухі.

***— Якую перавагу вам дае праца на тэлебачанні?***

— Я маю магчымасць рэалізаваць сябе. І вельмі лёгка рабіць гэта, калі працуеш у маладой крэатыўнай камандзе — такой, як у нас. Наш галоўны рэдактар Міхаіл Мілаванаў з'яўляецца нашым ідэйным натхняльнікам, у ім прысутнічае «дух авантурызму» і імкненне забяспечыць супрацоўнікам максімальна камфортныя ўмовы працы. Шчыра прызнацца, мы нават крыху распешчаныя.

***— З чаго пачалося ваша захапленне журналістыкай?***

— Я з дзяцінства хацела «варыцца ў гэтым катле», таму з 6 па 10 класы займалася ў секцыі журналістыкі ў Брэсце ў Цэтры маладзёжнай творчасці. Здавалася б, далейшы лёс вызначаны, але ў Бога былі іншыя планы. Сям'я пераехала ў горад Байканур. Я скончыла Міжнародную касмічную школу, затым атрымала вышэйшую эканамічную адукацыю і тры гады працавала па спецыяльнасці ў эканамічнай сферы. А потым злавіла сябе на думцы, што жыццё даецца адно і ў запасе яшчэ васьмі не будзе: чаму б не змяніць кардынальна род заняткаў? Страх абсалютна адсутнічаў — была толькі рашучасць. Варта адзначыць, што, нягледзячы на ўсю авантурнасць рашэння, яно было абдуманым. Мая парада ўсім: пры жаданні нешта змяніць — дзейнічайце! Часам не варта раздумваць доўга, бо ў сумненнях можа прайсці ўсё жыццё...

***— Дзе вам больш камфортна працуецца — у кадры альбо за кадрам?***

— Праграмы з маім удзелам выходзяць у запісе, што дае мне магчымасць быць на розных пазіцыях. Карцінка ў тэлевізары — гэта вяршыня айсберга, і наколькі прывабнай яна будзе, залежыць ад папярэдняй карпатлівай, засяроджанай і цяжкай працы. У нашай камандзе працуюць адказныя людзі, сапраўдныя прафесіяналы, таму нейкія накладкі здараюцца вельмі рэдка. Я ж стараюся спалучаць розныя задачы, каб пераключаць увагу, тады і вока не «замыльваецца» і творчасць не ператвараецца ў рамяство.

***— Як, на ваш погляд, змянілася сёння роля і пазіцыя тэлебачання ў кантэксце развіцця інтэрнэту?***

—У многіх маіх калег тэлевізара сёння няма наогул, бо ўсё неабходнае яны могуць знайсці ў інтэрнэце. І таму не дзіўна, што зараз актыўна развіваюцца інтэрнэт-каналы і спецыяльныя праекты, адаптаваныя для такой аўдыторыі. Гэта патрабаванне часу, і трэба гуляць па яго правілах. Усе праграмы «Мінск 24ДОК» выкладваюцца ў YouTube і сацыяльнай сетцы «УКантакце». Мы там, дзе і нашы гледачы.

***— Каго з тэлевядучых сучаснасці вылучаеце для сябе як прафесіяналаў?***

— Леанід Парфёнаў — тытан расійскай журналістыкі. Па-майстэрску падае матэрыял, нават з пасрэднай інфармацыйнай нагоды ўмее рабіць цікавыя сюжэты. Таксама вельмі паважаю Уладзіміра Познера. Дарэчы, абодва гэтыя тэлежурналісты вельмі ўдала, на мой погляд, сышліся ў праграме «Парфёнаў і Познер». У інтэрнэце «героем нашага часу» назаву Дзмітрыя Пучкова, больш вядомага як Гоблін. Яго праект у сеціве «Goblin News» рэпосцяць тысячы карыстальнікаў. Наогул жа тэлевядучы павінен быць кампетэнтным у тэме, якую абмяркоўвае. Яму трэба многае кантраляваць у эфіры, таму без засяроджанасці, уседлівасці і кемлівасці не абысціся.

***— У праекце «Настольны хакей. Забойны сезон» вы балельшчык ці бясстрасны назіральнік?***

— Спачатку была проста назіральнікам, аднак потым гульня захапіла і з'явіўся азарт, ды яшчэ які! У кадры вядучыя падаюць сухія факты: маўляў, «каманда «А» выбілася ў фаварыты, а каманда «В» адстала на 3 ачкі». А вось падчас матча можна назіраць, як я крычу, пляскаю ў далоні — словам, перажываю. І свае фаварыты з'явіліся, перамога якіх асабліва радавала. А наогул нават не думала, што кіданне шайбы па пластыкавым корабе можа быць такім захапляльным заняткам. Не дзіўна, што мільёны дарослых людзей удзельнічаюць у чэмпіянатах свету па гэтым «дзіцячым» відзе спорту.

***— Апішыце сваё стаўленне да спорту...***

— Станоўчае. Мой любімы від спорту — біятлон. Люблю яго за непрадказальнасць і відовішчнасць. Мару накрычацца на трыбунах падчас аднаго з этапаў кубка свету. Сама займаюся практычнай стральбой. Значныя вынікі пачалі з'яўляцца праз паўтара года трэніровак, хаця да дасканаласці ў маім выпадку яшчэ расці і расці. Спорт дапамагае і ў падтрыманні фізічнай формы. Два разы на тыдзень у мяне трэніроўкі ў ціры, наведванне трэнажорнай залы, басейна, паход у рускую лазню.

***— Вам заўсёды падабаецца, як выглядаеце ў кадры?***

— Мяне не столькі непакоіць мой знешні выгляд, колькі тое, як я працую. На мой погляд, задача тэлевядучага не сябе паказаць, а раскрыць суразмоўцу.

***— А стыль жаноцкасці і вытанчанасці блізкі вам у звычайным жыцці?***

— Я вельмі люблю спадніцы і сукенкі — яны складаюць 80 працэнтаў у маім гардэробе. З тканін аддаю перавагу шыфону і трыкатажу. У такіх строях адчуваю сябе найбольш упэўнена. Адзенне ж наогул вельмі ўплывае на паводзіны жанчыны і яе настрой.

***— Што для вас увогуле значыць «быць жанчынай»? Ці складана гэта ў сучасных рэаліях?***

— Ніколі не задумвалася над такім пытаннем, але, відаць, прыйшоў час. Быць жанчынай — значыць рабіць усё бездакорна. Калі ўдаецца, то і ў сучасных рэаліях праблем не павінна ўзнікаць. А вось у пытанні эмансіпацыі павінна прысутнічаць мера. Я не супраць самастойнасці і незалежнасці, але ў разумных прапорцыях. Мне падабаюцца галантныя мужчыны, якія ўступаюць месца, адчыняюць табе дзверы... Ці могуць жанчыны ўсё рабіць самі? Безумоўна! Аднак варта паказваць мужчынам, што яны нам патрэбны, і ўдзячнасць не прымусіць сябе чакаць.

**Нярэдка я бачу перамены пасля выхаду ў эфір чарговага выпуску праграмы. Напрыклад, з'яўляецца асфальт на разбітай дарозе, пра якую мы здымалі сюжэт, або ўносяцца змены ў расклад руху аўтобусаў на праблемных маршрутах.**

***— Чым тады вымяраецца паспяховасць? Як ацэньваеце свае дасягненні?***

— Мне здаецца, паспяховасць любога чалавека вызначаецца тым, што ён сабой уяўляе. Самадастатковасць цяпер рэдкая якасць: мы ўсе на нейкага раўняемся, імкнёмся да выдуманага дабрабыту. У вар'яцкай гонцы па жыцці трэба ўмець рабіць паўзы, іначай ёсць рызыка не трапіць у жаданае месца прызначэння. Я даволі крытычна стаўлюся да сябе, і прыродны максімалізм часам злосна жартуе са мной. Але сёння я задаволена тым, як складваецца маё жыццё.

***— Ці можна гэта расцэньваць як пазіцыю, што праца для вас не заўсёды ў прыярытэце?***

— Якой бы ні была напружанай праца, але ў прыярытэце ў мяне сям'я. З часам разумееш, не існуе нічога даражэйшага за блізкіх людзей. Мы з мужам стараемся планаваць свае графікі такім чынам, каб больш часу ўдавалася праводзіць разам. Цяпер гэта цэніцца значна больш, чым, напрыклад, пяць гадоў таму. Дзень ляжання на канапе не параўнаць з паўгадзінным шпацырам разам. І ў складаную хвіліну праца не абдыме цябе і не супакоіць: маўляў, усё будзе добра!

**Алена ДРАПКО.**

■ Спроба сіл

# КАСТЫНГ ДА ЭФІРУ ДАВЯДЗЕ

**У Белтэлерадыёкампаніі прайшоў першы этап адбору вядучых для тэлеканалаў «Беларусь 1», «Беларусь 2», «Беларусь 3», «Беларусь 5» і «Беларусь 24». Колькасць ахвотных паспрабаваць сябе склала больш за 50 чалавек. Прычым трапіць на блакітны экран захацелі не толькі выпускнікі факультэта журналістыкі, але і эканамісты, юрысты, выкладчыкі, вайскоўцы і нават гульцы ў покер.**



Адборам лепшых кандыдатаў займалася спецыяльная камісія, у склад якой уваходзілі кіраўнікі тэлеканалаў і тэлевізійныя прафесіяналы медыяхолдынга. Варта сказаць, што некаторыя з будучых тэлезорак здзіўлялі і звярталі на сябе ўвагу з першых хвілін з'яўлення. Іх і запрашалі на другі тур.

— Здзіўлялі перш за ўсё сваёй упэўненасцю, абаяльнасцю і ўменнем трымацца, падтрымліваць размову. Часам кандыдаты нават жартавалі і іранізавалі, адказваючы на нашы пытанні, — падзяліўся ўражаннямі намеснік галоўнага дырэктара галоўнай дырэкцыі тэлеканала «Беларусь 1» Сяргей Шышко. — Для нас галоўнай мэтай было зразумець, чаму чалавек выказвае жаданне працаваць на тэлебачанні, таму кожны з патэнцыяльных кандыдатаў павінен быў адстаяць свой пункт гледжання, аргументаваць пазіцыю. Большасці давялося адмовіць, бо не можа кожны першы сустрэчны быць прафесіяналам, калі адсутнічае талент. Будучым прэтэндэнтам скажу толькі адно: калі адчуваеце, што праца журналіста і вядучага на тэлебачанні — гэта ваша, то вызначыцеся з выбарам і прыходзьце да нас.

Члены журы задавалі ўдзельнікам каверзныя пытанні, каб паглядзець на рэакцыю, якая патрэбна, у тым ліку і для працы ў эфіры.

«Некаторым я даў шанц, прапанаваўшы для пачатку паспрабаваць сябе ў якасці карэспандэнта, рэпарцёра, — расказаў галоўны дырэктар Агенцтва тэленавін Кірыл Казакоў. — У Агенцтве тэлевізійных навін пастаянна ёсць магчымасць застацца ў нас, пачаўшы супрацоўнічаць. Аднак для гэтага патрэбна сапраўды праявіць сябе. Спадзяюся, што кастынг працягнецца і ў нас будзе магчымасць убачыць новых прэтэндэнтаў».

Дарэчы, многія з тых, каму ўдалося ў свой час паказаць сябе не толькі на кастынгу, але і ў працы — сёння працуюць у эфіры: Канстанцін Прыдыбайла, Паліна Іванча, Станіслаў Ліпскі, Ніна Мажэйка, Ксенія Кудраўцава, Наталля Тарасюк, Дзіяна Равякова.

Так, лёс Станіслава Ліпскага нібы спісаны з кнігі казачных гісторый. Былы супрацоўнік металургічнага завода сваім талентам і працавітасцю даказаў, што гаварыць пра спорт ён можа не горш за выпускнікоў Інстытута журналістыкі. Канстанцін Прыдыбайла даслаў сваю анкету на кастынг два гады таму, а сёння на яго творчым рахунку ўжо не адзін праект. Ксенія Кудраўцава спрабавала свае сілы некалькі гадоў таму, а потым даволі доўга чакала другога тэлефоннага званка. Сёння яна — вядучая выніковай праграмы тыдня «Галоўны эфір».

Нагадваем, кастынг працягваецца і Белтэлерадыёкампанія запрашае паспрабаваць сябе ўсіх мэтанакіраваных, таленавітых і харызматычных людзей, якія жадаюць дарыць гледачам добры настрой. Асноўныя патрабаванні да прэтэндэнтаў ранейшыя: узрост 25-45 гадоў, добрая дыкцыя, граматнае маўленне, уменне імправізаваць і свабоднае валоданне беларускай і рускай мовамі. Фотаздымкі (партрэт і ў поўны рост) і анкету неабходна дасылаць на адрас casting@tvr.by. Анкету можна знайсці на сайце Белтэлерадыёкампаніі www.tvr.by ў раздзеле «Кастынг вядучых».

Як абяцае кіраўніцтва тэлеканалаў, новыя твары ў эфіры з'явяцца ўжо гэтай восенню, у пачатку тэлевізійнага сезона 2014—2015.

**Алена ДРАПКО**

■ Медыяпрастора

# МАДАМ

| | | | |
|---|---|---|---|
| Брэст | 106.6 FM | | |
| Віцебск | 101.8 FM | Бабруйск | 103.6 FM |
| Мінск | 107.1 FM | Баранавічы | 98.4 FM |
| Гродна | 104.2 FM | Салігорск | 104.3 FM |
| Магілёў | 107.8 FM | Пінск | 103.2 FM |

Як прывабіць да сябе мужчыну? Многія жанчыны задаюцца гэтым пытаннем, бо вядома, што з дапамогай умела пабудаванай гутаркі можна не толькі выклікаць прыхільнасць суразмоўцы, але і літаральна закахаць яго ў сябе. Што для гэтага трэба? Галоўнае правіла гутаркі — натхніць мужчыну на тыя ўспаміны пра яго жыццё, якія маюць важнае значэнне і раскрываюць пачуцці. Няхай ён будзе апавядальнікам, а вы — удзячным слухачом. Чым больш ён будзе вам распавядаць, тым мацней будзе прывязвацца да вас.

Чым спатрэбіцца ахвяраваць? Сваім часам! Бо для любой паўнавартаснай гутаркі ён проста неабходны. Таксама прыйдзецца адмовіцца ад негатыўных эмоцый і адмоўных ацэнак. Задавайце пытанні, паказвайце мужчыну, што ён — важная персона ў вашых вачах. Стварайце добразычлівую і даверлівую атмасферу, суперажывайце. Вялікі псіхіятр Зігмунд Фрэйд выявіў, што ўсе яго пацыенткі ўлюбляліся ў яго пасля таго, як дзяліліся сваімі думкамі, расказвалі пра любоўныя перажыванні і тыя падзеі жыцця, якія мелі для іх асаблівае эмацыянальнае значэнне. Ён не быў прыгажуном і нават хаваўся ад сваіх падапечных за шырмай, але гутарка ішла, і пацыенткі ўсё роўна ўлюбляліся.

Гэта толькі адна са шматлікіх тэм праграмы «Мадам». Праграмы, у якой вядучая Ірына Пятровіч распавядае пра пытанні ўзаемаадносін, псіхалогіі, выхавання дзяцей, прыгажосці і здароўя. Слухайце нас кожную суботу ў 18.15 на хвалях радыё «Мір» .

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ПАНЯДЗЕЛАК, 21 КРАСАВІКА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!.
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.05** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.45** Зона X.
**9.10, 18.35** Eurovision. Без каментарыяў.
**9.15** Галоўны эфір.
**10.10** Клуб рэдактараў.
**10.55** «Мая праўда». «Альбана Карызі. Каварная фелічыта».
**12.10, 0.35** Дак. серыял «Містычныя гісторыі».
**13.10 Серыял «9 месяцаў».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Славянскі базар у Віцебску-2014. Нацыянальны адбор.
**15.30 Серыял «След».**
**16.30** «Сямейныя меладрамы».
**17.30** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**19.55** Форум.
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «Замах». 1-я і 2-я серыі.**
**23.35** Актуальнае інтэрв'ю.
**0.20** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 10.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Серыял «Двое з куфра 2».**
**10.35, 0.20 Серыял «Я — целаахоўнік».**
**11.40 Серыял «Ластаўчына гняздо».**
**13.40** «Два з паловай кухары. Адкрытая кухня».
**14.10 Меладрама «Джэры Магуаер».**
**16.45, 23.35** Ток-шоу «Перазагрузка».
**17.30** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**18.55 Серыял «Разумнік». 1-я, 2-я серыі.**
**20.50** Дак. серыял «Азбука добрага самаадчування». 1-я серыя.
**21.25** КЕНО.
**21.30 Серыял «Універ. Новы інтэрнат».**
**22.35 Серыял «Рэальныя хлопцы».**
**1.10** Музычны конкурс «GBOB» у Беларусі.

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабраранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 13.25, 15.00, 17.00, 21.05, 23.55** «Калейдаскоп».
**8.10, 13.35, 15.10, 17.10, 0.05** «Сімвалы эпохі». Сталоўка.
**8.20 Дзіцячы фільм. «Чароўны голас Джэльсаміна». 1-я і 2-я серыі.**
**10.30, 22.00** «Дыя@блог». «Пра мову».
**11.00, 21.15 Серыял «Мегрэ».**
**11.40, 23.30** «Святло далёкай зоркі». Памяці народнага мастака БССР Валянціна Волкава.
**12.10, 14.30, 16.15, 18.30** «Размаўляем па-беларуску».
**12.15** «Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Г.І. Цітовіча». Канцэрт.
**13.50** «Актрыса». Дак. фільм.
**14.20** «Росчырк часу».
**14.35** «Цуды прыроды».
**15.25, 0.20** «Есть только миг...». Аляксандр Чуланаў.
**15.50** «Ваенна-палявая пошта». Дак. фільм.
**16.20** «Сямейны альбом». Сям'я Карачун.
**16.35** «Малады дубок». Кароткаметражны фільм паводле аднайменнага твора Якуба Коласа.
**17.20** «Скарбніца Мінշчыны». Гісторыя, культура і архітэктура мястэчка Сноў.
**17.50** «Тэатральны ліцэй».
**18.15** «Найменні і вобразы».
**18.35** М/ф.
**18.55** «Кругі надзеі». Дак. фільм.
**19.25** «Пейзажы скрозь час». Дом Фрэдэрыка Чэрджа ў Алана.
**19.55 Серыял «Зорка эпохі».**
**20.45** Калыханка.
**22.25 «Выпадковая сустрэча». Маст. фільм.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**8.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Чэлсі» — «Сандэрлэнд».
**10.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Эвертан» — «Манчэстэр Юнайтэд».
**11.55** Хакей. КХЛ. Фінал. «Металург» — «Леў».
**13.45** Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Беларусі. «Тарпеда-БелАЗ» — «Дынама» (Брэст).
**15.35** Футбол. На шляху да чэмпіянату свету-2014. Відэачасопіс.
**16.05** Хакей. Еўравыклік. Беларусь — Швейцарыя.
**17.55** Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Мінск) — «ФК Мінск».
**19.45** Авертайм. Кубак газпрамнафты.
**20.15** Час футбола.
**21.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**21.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Манчэстэр Сіці» — «Вест Бромвіч».
**23.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.05** «Жыць здорава!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «У наш час».
**12.05** «Яны і мы».
**13.10** «Справа ваша...».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.15** «Востраў Крым».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Адваротны адлік». «Спецпасяленцы. Сялянская трагедыя». Фільм другі.
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** «Справа прынцыпу».
**22.25** «Канцэрт Яні Хрысомаліс».
**23.40 Маст. фільм «Скандальны дзённік».**
**1.25** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.45** «Вялікае снеданне».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.40** «Такі лёс».
**12.30** «Чатыры вяселлі».
**13.50** «Вялікі горад».
**14.30** «Далёкія сваякі».
**14.45** «Зорны рынг. Новы сезон. Бітва кавер-бэндаў».
**15.45** «Іншая краіна». «Добрай раніцы, В'етнам!».
**16.20** «Наша справа».
**16.50** «Следакі».
**18.30** «Ежа багоў».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Маст. фільм «Код доступу «Сафія».**
**22.00** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**23.00** «Ваенная тайна».

### МІР

**5.00** «180 хвілін».
**7.15, 23.00** Беларусь сёння.
**8.15 Серыял «Спас пад бярозамі».**
**10.00, 0.45 Маст. фільм «Формула вясёлкі».**
**11.30** «Наша марка».
**12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**12.20 Серыял «Чужыя памылкі».**
**14.05** Дак. фільм «Тайныя знакі».
**15.20, 23.30** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.10, 3.45 Серыял «Монтэкрыста».**
**18.20 Серыял «Двое з куфра-2».**
**21.20 Серыял «Вакзал».**
**0.20** «Агульны інтарэс».
**2.05 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Прамы эфір».
**12.45** «Асаблівы выпадак».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.25** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Узарваць СССР. Ядзерны апакаліпсіс».
**15.35** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**17.10 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».**
**18.05 Серыял «Пакуль станіца спіць».**
**18.55 Серыял «Асабовая справа».**
**20.45 Серыял «Скліфасоўскі-3».**
**23.35** «Ад Пятра да Мікалая. Традыцыі рускіх палкоў».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.40** «Новыя рускія сенсацыі».
**9.40, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55, 13.25** «Суд прысяжных».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.10** «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
**15.40, 18.35, 23.00** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**19.35 Серыял «Чужы раён».**
**21.20 Маст. фільм «Настаяцель».**
**23.20** Сёння. Вынікі.
**23.45 Маст. фільм «Настаяцель-2».**

### 8 КАНАЛ

***7.00—16.00 Прафілактыка.***
**16.00** Мультпарад.
**16.30** Тэлемагазін.
**17.00 Серыял «Вікінгі».**
**17.55 Серыял «Сапраўдны дэтэктыў».**
**19.05, 20.55, 23.50** «Надвор'е».
**19.10 Серыял «Тайныя сувязі».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Драма «Лабірынт Фаўна».**
**23.05 Серыял «Спіс кліентаў».**

### ВТБ

**6.00, 1.00** “PLAY”.
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 18.15, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00** «Спытайце кухара».
**10.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**11.00, 19.00 Серыял «Маладзёжка».**
**13.00** «Кіно ў дэталях».
**14.00, 23.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**15.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».**
**16.00 Трылер «Знак».**
**18.30, 0.00** «Лаві момант».
**21.10 Меладрама «Чаго чакаць, калі чакаеш дзіця».**

### КУЛЬТУРА

**6.00** «Еўраньюс».
**9.00, 14.00, 18.00, 22.00** Навіны культуры.
**9.15, 0.40** «Наглядальнік».
**10.15 Маст. фільм «З вечара да паўдня».**
**12.35** Academia.
**13.20** Дак. фільм «Чалавек эры Кольца. Іван Яфрэмаў».
**14.10** Дак. фільм «Лявон Лазараў. Крок у вечнасць».
**14.40 Маст. фільм «Калегі».**
**16.20** «Шэкспір і Чайкоўскі». Уверцюры «Гамлет», «Рамэа і Джульета».
**17.15** Легендарнаму тэатру — 50! «Залатое стагоддзе Таганкі». «Добры чалавек з Сезуана».
**18.15** Галоўная роля.
**18.30** «Сацi. Нясумная класіка...».
**19.10** «Правілы жыцця».
**19.40** Да 85-годдзя з дня нараджэння Вадзіма Юсава. «Астравы».
**20.25** Дак. фільм «Загадка муміі Рамсеса».
**21.10** «Тым часам».
**22.20** Шэкспір — 450. Маст. фільм «Рычард II».
**1.35** «Вячэрні звон». Канцэрт ААРНІ ВГТРК.

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Быў час»: «Тэлебачанне, якое мы страцілі». 2004 год.
**6.00** «Гукавая дарожка» ў Крамлі». 1994 год.
**7.00** Сустрэча ў «Астанкіна» з Міхаілам Ульянавым. 1981 год.
**8.00** «Аншлаг? Аншлаг!». 1990 год.
**8.55** **«Вырадак». Маст. фільм.**
**10.25** «Залатая Еўропа-92». Канцэрт.
**11.00** «Этапы вялікага шляху». А. Шырвінт і М. Дзяржавін. 1993 год.
**12.00, 3.00** «Колба часу».
**13.05** «Начны хіт». Канцэрт.
**14.00** «Што? Дзе? Калі?». Фінальная гульня 1980 года.
**15.20** «Першы раз на эстрадзе». Іраклій Андронікаў. 1971 год.
**16.30 «У Альдэбаран!». Кароткаметражны фільм.**
**17.00** «...Да 16 і старэйшым». 1989 год.
**17.50** «440 Герц». 1993 год.
**18.30, 0.35 Серыял «Дзень за днём».**
**19.35** Канцэрт замежнай эстрады.
**20.00, 2.00** «Мінулы час».
**21.00** «Народжаныя ў СССР».
**22.00** «Музычны рынг». 1989 год. 1-я частка.
**23.00** «У нас у гасцях Булат Акуджава». 1972 год.
**23.20** «Ранішняя пошта». «Тэатр». 1988 год.
**0.00** «Нью-Ёрк, Нью-Ёрк». 1995 год.
**4.00** «Кінапанарама». 1991 год. 1-я частка.

### EUROSPORT

**9.30** Аўта- і мотаспорт.
**9.45** Чэмпіянат свету ў класе Турынг.
**10.45, 15.30** Веласпорт. Гонка «AMSTEL GOLD».
**12.00, 16.30, 20.30** Снукер. Чэмпіянат свету.
**15.00** All Sports.
**19.30** Футбол. Еўрагалы.
**20.15** Тэлечасопіс WATTS.
**0.00** Конны спорт. Спаборніцтвы па скачках.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05** Скетчком «Паміж намі».
**5.15, 8.00, 12.55, 2.20** Серыял «Пасля твайго адыходу».
**6.15** Камедыя «Закінутыя ў лесе».
**7.40, 10.40, 12.40, 15.45, 16.45, 23.55** «Камедыянты. Лепшае».
**9.00** Камедыя «Шанцуе, як тапельцу».
**11.15** Камедыя «Дзіця напракат».
**13.35** Камедыя «Валацуга».
**14.10** Камедыя «Аўтобусны прыпынак».
**16.00** Камедыя «Пасля твайго адыходу. Калядны выпуск 2007».
**17.20** Камедыя «Госць».
**19.20** Камедыя «Не злоўлены — не злодзей».
**21.00** Серыял «Як не варта жыць». 1-я серыя.
**22.10** Камедыя «Сардэчна запрашаем на поўдзень».
**0.10** Камедыя «Нявеста, якая ўцякла».
**3.25** Мюзікл «Джэнтльмены аддаюць перавагу бландзінкам».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.20** «Сардэчна запрашаем дадому!».
**9.00, 18.30, 3.15** Серыял «Забароненае каханне».
**10.15** «Паненка і кулінар».
**10.45, 17.00** Дак. серыял «Паралельны свет».
**11.45, 16.00** Дак. серыял «Варажбітка».
**12.45, 18.00** Дак. серыял «Паляўнічыя на прывідаў».
**13.15** «Жонка. Гісторыя кахання». Алена Санаева.
**14.30** «Сто пытанняў дарослламу». Канстанцін Крукаў.
**15.15, 0.10, 5.15** Серыял «Звышнатуральнае».
**19.55** Серыял «Контргульня».
**20.55, 4.30** Серыял «Чырвоная капэла».
**21.55** Маст. фільм «Венецыянскі купец».
**00.55** Серыял «Хадзячыя мерцвякі».
**1.40** «Часова даступны». Нона Грышаева.
**2.35** «Без падману».

### ТБ1000

**5.00** Драма «Тысяча акраў».
**6.55** Баявік «Легенда Зора».
**9.10** Драма «Доўгія заручыны».
**11.30** Драма «Мушкецёры».
**13.30** Камедыя «Лары Краўн».
**15.15** Камедыя «Каханне з апавяшчэннем».
**17.05** Камедыя «Вяселле майго лепшага сябра».
**19.00** Драма «Гульні страсці».
**20.35** Драма «Лэдзі».
**22.55** Камедыя «Піпец».
**0.50** Драма «Калі ты ў апошні раз бачыў свайго бацьку?».
**2.30** Баявік «Воін».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Трагікамедыя «Баламут».
**8.00** Меладрама «Гувернантка».
**10.00** Трагікамедыя «Аддаць канцы».
**12.00** Драма «Маленькая Вера».
**14.30** Камедыя «Практыкаванні ў цудоўным».
**16.30** Камедыя «Апельсінавы сок».
**18.20** Казка «Казка. Ёсць».
**20.00** Меладрама «Мамы».
**22.00** Меладрама «8 першых спатканняў».
**23.40** Камедыя «Кантракт на каханне».
**1.40** Камедыя «Здзелка».
**3.50** Драма «Я таксама хачу».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00** Найцяжэйшы ў свецe рамонт.
**6.00, 16.00** Рыбы-пачвары.
**7.00** Апошняя львіца.
**8.00, 13.00, 18.00, 21.00, 0.00, 3.00** Космас.
**10.00** Мегазаводы.
**11.00** Прыроджаны байкер.
**12.00** Золата Юкана.
**15.00** Напад каётаў.
**17.00, 2.00** Паветраныя асы вайны.
**20.00, 1.00, 4.00** Навука будучыні.
**23.00** Расследаванні авіякатастроф.

### DISCOVERY

**7.00** Амерыканскі чопер.
**7.50, 12.20** Сысці ад пагоні.
**8.40, 20.35** Як гэта ўстроена?
**9.10, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35** Скарбашукальнікі Амерыкі.
**10.30, 0.55** Top Gear.
**11.25** Не спрабуйце паўтарыць.
**13.15, 16.25, 6.05** Махінатары.
**14.10, 3.55** Хуткія і гучныя.
**15.05** Беар Грылс: выбрацца жывым.
**16.00** Пятая перадача.
**17.20, 3.05** Паляўнічыя на рэліквіі.
**18.15** Будаўніцтва небаскроба «Шард».
**19.10** Навука магіі.
**21.00** Рэальныя дальнабойшчыкі.
**22.00** Выжыванне без купюр.
**23.00** Голыя і напалоханыя.
**0.00** Клондайк.
**1.50** Сапраўдныя аферысты.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.
**5.10** Будучыня.

## ПЯТНІЦА, 25 КРАСАВІКА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.55** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.20** Зона Х.
**9.10, 18.05** Eurovision. Без каментарыяў.
**9.15, 20.00 Серыял «Замах». Заключныя серыі.**
**10.55, 20.00 Серыял «Парфумерка».**
**11.55, 15.25** Галявая перадача.
**12.10, 1.25** Дак. серыял «Містычныя гісторыі».
**13.05 Серыял «Двайное жыццё».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.30 Серыял «След».**
**16.20** «Сямейныя меладрамы».
**17.10** «Мая праўда». «Мікеле Плачыда. Тайна камісара Катані».
**18.10** Тайны следства.
**21.00** Панарама.
**21.45** Нашы.
**21.55** Журналіцкае расследаванне.
**22.30 Прыгоды «Піраты Карыбскага мора: куфар мерцвяка».**
**1.10** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.30** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Серыял «Двое з куфра 2».**
**10.10** Стыль-бюро.
**10.50 Камедыя «Шукайце жанчыну». 2-я серыя.**
**12.15 Серыял «Разумнік».**
**14.10** «Два з паловай кухары».
**14.45 Серыял «Рэальныя хлопцы».**
**16.00** «Імперыя песні».
**17.05** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**18.55 Прыгоды «Чалавек-павук 3: вораг у адлюстраванні».**
**21.25** КЕНО.
**21.35** Экстрасэнсы вядуць расследаванне.
**22.45** Рэпарцёр.
**23.35** «Comedy woman».
**0.30 Трылер «Цана страсці».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабраранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 12.35, 15.00, 17.00, 21.05, 0.40** «Калейдаскоп».
**8.10, 12.45, 15.10, 17.10, 0.50** «Сімвалы эпохі». Гандлёвая сетка «Бярозка».
**8.20 Серыял «Зорка эпохі».**
**9.15, 22.05** «Сіла веры».
**9.40, 21.15 Серыял «Мегрэ».**
**10.30, 0.15** «Святло далёкай зоркі». Памяці мастака Анатоля Волкава.
**10.55, 14.10, 16.05** «Размаўляем па-беларуску».
**11.00 «Квартэт Гварнеры». Маст. фільм.**
**13.00** «Скарбніца Міншчыны». Гісторыя, культура і архітэктура мястэчка Даўгінава.
**13.25** «Росчырк часу».
**13.40** «Дэбют». Кароткаметражны фільм.
**14.15** «Наша спадчына». Пахавальня ў Суботніках.
**14.30** «Падарожжа са смакам».
**15.20** «Масква—Мінск. Кінатранзіт». Барыс Плотнікаў. «Узыходжанне».
**15.50** «Палескі пачастунак». Кулага і фаршыраваная бульба.
**16.10** «Карані».
**16.35** «Цуды прыроды».
**17.25** «Плошча мастацтваў». Педагог, акцёр Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Вячаслаў Паўлюць.
**17.50** М/ф.
**18.10** «Любоў і жыццё маё...». Дак. фільм пра кампазітара Уладзіміра Кандрусевіча.
**18.40** «Музеум». Гістарычны партрэт.
**18.55** «Полета вольное упорство...». Дак. фільм.
**19.25 «Неба ўсюды аднолькавае». Маст. фільм.**
**20.45** Калыханка.
**22.30** Шлягеры на ўсе часы. «Запомні гэтае імгненне». Канцэрт з твораў Мікаэла Тарывердзіева.
**23.50** «АРТіШОК».

### БЕЛАРУСЬ 5

**8.10** Футбол. Ліга Еўропы. 1/2 фіналу. Першы матч. «Бенфіка» — «Ювентус».
**10.05** Хакей. КХЛ. Фінал. «Леў» — «Металург».
**12.00** Футбол. Ліга Еўропы. 1/2 фіналу. Першы матч. «Севілья» — «Валенсія».
**13.55, 21.25—1.25** Тэніс. Турнір ВТА. Штутгарт. 1/4 фіналу.
**16.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**16.55, 19.25** Валейбол. Чэмпіянат Беларусі. Фінальная серыя.
**18.55** Фактар сілы.
**1.25** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «У наш час».
**12.05** «Яны і мы».
**13.10** «Справа ваша...».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00** «Адваротны адлік». «Скарбы Радзівілаў. Згублены след».
**15.30** «Вучыцца жыць».
**16.15** «Востраў Крым».
**16.55** «Турынская плашчаніца».
**18.20** «Чакай мяне. Беларусь».
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.05** «Вячэрні Мінск».
**22.20 Маст. фільм «Нянька па выкліку».**
**0.10 Баявік «Механік».**
**1.45** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**9.00** «Вам і не снілася».
**10.05** «Аўтапанарама».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35 Серыял «Вовачка 4».**
**12.05** «Сямейныя драмы».
**13.00** «Прывітанне, доктар».
**13.50 Маст. фільм «Жонка астранаўта».**
**15.50** «Не хлусі мне!».
**16.50** «Следакі».
**18.30** «Такі лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Камедыя «Міс Ніхто».**
**22.00, 23.00** «На тым жа месцы ў той жа час».
**23.50** «Вялікая гульня». Покер-дуэль.
**0.35 Маст. фільм «Рок-н-рольшчык».**

### МІР

**5.00** «180 хвілін».
**8.15, 3.15 Серыял «Спас пад бярозамі».**
**10.00 Маст. фільм «Вусаты нянь».**
**11.30** «Сардэчна запрашаем».
**12.00, 15.00, 18.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**12.20 Серыял «Чужыя памылкі».**
**14.05, 2.25** Дак. серыял «Тайныя знакі».
**15.20** Ток-шоу «Яшчэ не разам».
**16.10, 0.15 Серыял «Монтэкрыста».**
**18.20 Серыял «Рабіны гронкі пунсовыя».**
**21.40** Скетч-шоу «МасГарСмех».
**22.35 Маст. фільм «Радня».**
**2.10** «Прыгоды Македонскай».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Асаблівы выпадак».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Прамы эфір».
**12.45 Серыял «Капітан Гардзееў».**
**13.50, 16.50, 19.50, 22.40** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Ружа з шыпамі для Мірэй. Руская француженка».
**15.35** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**16.35** «Уся Расія».
**17.10 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».**
**18.05 Серыял «Пакуль станіца спіць».**
**18.55 Серыял «Асабовая справа».**
**20.55** «Паядынак».
**22.50 Маст. фільм «Географ глобус прапіў».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.45, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55, 13.25** «Суд прысяжных».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.15** «Справа густу».
**15.40, 18.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**19.35 Серыял «Чужы раён».**
**21.15 Серыял «Браценікі».**
**23.00 Серыял «Інспектар Купер».**
**0.35** «Авіятары».

### 8 КАНАЛ

**7.00, 11.55, 19.05, 20.55, 23.55** «Надвор'е».
**7.05, 15.50** Мультпарад.
**7.30 Драма «Афіцэр з ружай».**
**9.25, 18.00 Серыял «Сапраўдны дэтэктыў».**
**10.30** «Мой любімы гадаванец».
**11.00 Серыял «Тайныя сувязі».**
**12.00 Серыял «Мушкецёры».**
**13.10** Тэлемагазін.
**13.30 Серыял «У чым віна Фатмагуль».**
**15.00 Дэтэктыў «Айцец Браўн».**
**16.20** «Адшукваецца адпачынак».
**16.50 Серыял «Вікінгі».**
**17.40** Тэлемагазін.
**19.10 Серыял «Плашч».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Баявік «Прывідны гоншчык».**
**23.00 Серыял «Каварныя пакаёўкі».**

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 18.00, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00** «Астралогія кахання».
**10.00** «Гардэроб на вылет».
**11.00, 19.00 Серыял «Маладзёжка».**
**13.00, 23.15** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**14.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**15.00 Серыял «Нанакаханне».**
**16.00 Трылер «Спрытныя рукі».**
**18.30, 0.00** «Лаві момант».
**21.10 Меладрама «Лапачка».**

### КУЛЬТУРА

**5.30** «Еўраньюс».
**9.00, 14.00, 18.00, 22.00** Навіны культуры.
**9.20** Дак. фільм «Саюзнікі. Верай і праўдай!».
**10.25 Маст. фільм «Генрых V».**
**12.40** Важныя рэчы. «Палка А.С. Пушкіна».
**13.00** «Правілы жыцця».
**13.30** «Пісьмы з правінцыі». Ёшкар-Ала.
**14.10** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**14.50** «Царская ложа». Галерэя музыкі.
**15.30** Дак. фільм «Дэвід Лівінгстан».
**15.40 Маст. фільм «Дзікі сабака дзінга».**
**17.15** Легендарнай Таганцы — 50! «Тэатр на «вулкане».
**18.15** Смеханастальгія.
**18.45, 0.55** «Шукальнікі». «Завяшчанне Сцялецкага».
**19.35 Маст. фільм «Не гаруй!».**
**21.05** «Лінія жыцця». Юрый Любімаў.
**22.20** Спектаклі-легенды. «Дзесяць дзён, якія ўзрушылі свет». Запіс 1987 года.
**0.45** М/ф: «Ух ты, рыба гаворыць!», «Гэта зусім не пра гэта».
**1.40** «Сусветныя скарбы культуры».

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Чалавек, зямля, Сусвет». 1981 год.
**5.50** «Музыка ў тэатры, кіно на ТБ». 1985 год.
**6.30, 12.20 «Час-не-чакае». Маст. фільм.**
**7.45** «Добрай ночы, малыя». 1990 год.
**8.00, 14.00, 20.00, 2.00** «Мінулы час».
**9.00, 15.00, 3.00** «Народжаныя ў СССР».
**10.00, 4.00** «Музычны рынг». 1989 год.
**11.00** «Чалавек і закон». 1994 год.
**11.30** «Няма за мяне шчаслівей!». Н.а. СССР Т. Шмыга. 1971 год.
**13.40** Канцэрт замежнай эстрады.
**16.00** «Погляд». 1989 год.
**17.00** «Бачу цэль!». Дак. фільм.
**17.30** «Ранішняя пошта». 1991 год.
**18.05** «Нью-Ёрк, Нью-Ёрк». 1995 год.
**18.45 «Ён, яна і дзеці». Маст. фільм.**
**21.00** «Колба часу».
**22.00** «Кінапанарама». 1991 год.
**23.00** «Летапіс паўстагоддзя». Дак. фільм.
**0.00** «Музычны кіёск». 1993 год.
**0.35 Серыял «Дзень за днём».**
**1.45** «Песні Мацвея Блантэра». Фільм-канцэрт.

### EUROSPORT

**9.30, 15.00** Футзала. Кубак УЕФА.
**11.00, 16.30** Снукер. Чэмпіянат свету.
**0.00** Тэлечасопіс WATTS.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05** Скетчком «Паміж намі».
**5.15, 7.50, 12.55, 16.00, 21.00, 2.20** Серыял «Як не варта жыць».
**6.15** Камедыя «Замарожаны».
**7.35, 23.50, 1.50** «Камедыянты. Лепшае».
**8.50** Камедыя «Усмешка Бога, або Чыста адэская гісторыя».
**11.15** Камедыя «Подыум».
**14.10** Камедыя «Больш, чым сябар».
**17.20** Мюзікл «Другі хор».
**19.20** Камедыя «Нянькі».
**22.10** Камедыя «Няма чаго дэклараваць».
**0.10** Камедыя «Зямныя дзяўчаты лёгка даступныя».
**3.25** Камедыя «Не злоўлены — не злодзей».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.45, 14.45, 1.00** «Доктар І...».
**9.15, 18.30, 4.55** Серыял «Забароненае каханне».
**10.30, 17.00** Дак. серыял «Паралельны свет».
**11.30, 16.00** Дак. серыял «Варажбітка».
**12.30, 18.00** Дак. серыял «Паляўнічыя на прывідаў».
**13.00** Серыял «Контргульня». Заключная серыя.
**13.50** «Дом уверх дном».
**15.15, 1.30** Серыял «Звышнатуральнае».
**19.50** Камедыя «На цвярозую галаву».
**22.00** Маст. фільм «Праклён Залатой Кветкі».
**0.00** Серыял «Каліфрэнія».

### ТБ1000

**5.00, 13.00** Камедыя «Хлопчыкам гэта падабаецца».
**6.50** Драма «Праз Сусвет».
**9.15** Баявік «Галівудскія копы».
**11.25** Камедыя «Джэк і Джыл: Каханне на чамаданах».
**14.55** Баявік «Кілеры».
**16.45** Драма «Каханне».
**19.00** Трылер «Сачэнне».
**20.35** Драма «Паляўнічы».
**22.20** Камедыя «Нязносны Генры».
**0.05** Трылер «Хаціна ў лесе».
**1.45** Трылер «Суіні Тод, дэман-цырульнік з Фліт-стрыт».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Камедыя «Іван Броўкін на цаліне».
**7.45** Камедыя «Асаблівасці нацыянальнай палітыкі».
**9.20** Драма «Выгнанне».
**12.10** Драма «Маладая жонка».
**14.00** Трагікамедыя «Белы маўр, або Інтымныя гісторыі пра маіх суседзяў».
**16.00** Драма «Агні прытона».
**18.00** Меладрама «Летам я аддаю перавагу вяселлю».
**20.00** Дэтэктыў «Забойства на 100 мільёнаў».
**22.00** Драма «Забава».
**23.40** Камедыя «Апельсінавы сок».
**1.30** Драма «Маленькая Вера».
**4.00** Камедыя «Спартакіяда. Лакальнае пацяпленне».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00** Найцяжэйшы ў свеце рамонт.
**6.00, 16.00** Рыбы-пачвары.
**7.00** Выратаваны львіцай.
**8.00, 13.00, 22.00** Дзікі тунец.
**10.00** Мегазаводы.
**11.00** Прыроджаны байкер.
**12.00** Золата Юкана.
**15.00** Тайны гуансійскіх пячор.
**17.00, 2.00** Верталётныя баталіі.
**18.00** Турэмныя цяжкасці.
**19.00** Займальная навука.
**20.00, 0.00, 3.00** Космас.
**23.00** Жах у нябёсах.

### DISCOVERY

**7.00** Класіка з Паўднёвага пляжа.
**7.50, 12.20** Хлопцы з Юкана.
**8.40, 20.35** Як гэта ўстроена?
**9.10, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35** Адпетыя рыэлтары.
**10.30, 0.55** Top Gear.
**11.25** Пераломны момант.
**13.15, 16.25, 6.05** Махінатары.
**14.10, 3.55** Амерыканскі чопер.
**15.05** Выжыванне без купюр.
**16.00** Пятая перадача.
**17.20, 3.05** Што ў вас у гаражы?
**18.15** Залатая ліхаманка.
**21.00** Пяцёрка лепшых.
**22.00** Неверагодны небаскроб.
**23.00** Пытанні светабудовы.
**0.00** Кландайк.
**1.50** Сапраўдныя аферысты.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.
**5.10** Не спрабуйце паўтарыць.

## СУБОТА, 26 КРАСАВІКА

### БЕЛАРУСЬ 1

**5.25** Існасць.
**5.50 Меладрама «Тры таварышы».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Клуб рэдактараў.
**9.50, 23.50 Серыял «Сваты 3».**
**10.55** «Пра ежу!».
**11.25** Дача.
**12.10** Славянскі базар у Віцебску-2014. Нацыянальны адбор.
**12.15** Здароўе.
**13.00, 15.50** Давярай і правярай.
**13.35** Журналіцкае расследаванне.
**14.10** Вакол планеты.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** Мірны тур.
**16.20, 0.40** «Вялікая розніца».
**17.25 Меладрама «Бесталковая нявестка».**
**21.00** Панарама.
**21.40 Маст. фільм «Круты паварот».**
**23.40** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.30 Серыял «Ластаўчына гняздо».**
**8.25, 21.10** Тэлебарометр.
**8.30** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**9.45** Беларуская кухня.
**10.30** «Два з паловай кухары».
**11.00, 21.50 Серыял «Інтэрны».**
**13.30** Вышэй за дах.
**14.05** Экстрасэнсы вядуць расследаванне.
**15.15 Камедыя «Шукайце жанчыну».**
**18.00** «Імперыя песні».
**19.15** Ваша лато.
**19.55** Латарэя «Пяцёрачка».
**20.05** «Суперінтуіцыя. Каханне».
**21.05** КЕНО.
**21.15** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**0.10 Баявік «Скарб Амазонкі».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 11.10, 13.00, 17.25, 21.05, 0.40** «Калейдаскоп».
**8.05, 11.20, 13.05, 17.35, 0.45** «Сімвалы эпохі». Піянерскі лагер «Артэк».
**8.20, 11.30, 13.20, 17.45, 1.00** «Галасы з мінулага». 115 гадоў з дня нараджэння пісьменніка, заслужанага дзеяча культуры Беларусі Ільі Данілавіча Гурскага.
**8.25** «Таямніца душы».
**8.55** «АРТіШОК».
**9.25 «Неба ўсюды аднолькавае». Маст. фільм.**
**10.45** «Наперад у мінулае».
**11.40** «Свет прыроды». Лесабалотны комплекс Чырвоны бор.
**12.05** «Шчасце Алены». Сцэнарыст і рэжысёр Алена Турава.
**12.25, 14.15, 17.55** «Размаўляем па-беларуску».
**12.35** «Плошча мастацтваў». Творчасць мастака Васіля Касцючэнкі.
**13.25** «Дзед Аўсей і Палашка». Кароткаметражны фільм па матывах апавядання Міхася Лынькова.
**13.50** «Карані».
**14.25** М/ф.
**14.45 «Я помню». Маст. фільм.**
**16.10** Шлягеры на ўсе часы. «Запомні гэтае імгненне». Канцэрт з твораў Мікаэла Тарывердзіева.
**18.00** «Сола для трубы». Дак. фільм.
**18.45 «Увесь гэты джаз». Маст. фільм.**
**20.45** Калыханка.
**21.10 Сусветнае кіно. «Сталкер». 1-я і 2-я серыі.**
**23.45** «Гісторыя беларускай оперы». Дак. фільм.

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.05, 11.05, 15.55, 18.25** Валейбол. Чэмпіянат Беларусі. Фінальная серыя.
**9.05** Тэніс. Турнір ВТА. Штутгарт. 1/4 фіналу.
**13.05** Еўрапейскі покерны тур.
**13.55** Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Беларусі. «Гомель» — «Дынама» (Мінск).
**17.55** Фактар сілы.
**20.25** Хакей. КХЛ. Фінал. «Металург» — «Леў».
**22.15—2.15** Тэніс. Турнір ВТА. Штутгарт. 1/2 фіналу.

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі». Новыя прыгоды.
**9.20** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.05** «Ідэальны рамонт».
**12.05** «Разумніцы і разумнікі».
**12.50** Ералаш.
**13.15** «Леў Прыгуноў. Джэймс Бонд Савецкага Саюза».
**14.15 Дэтэктыў «Карчма на Пятніцкай».**
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Адгадай мелодыю».
**16.50** «Бацькоў у школу».
**17.45** «Адзін супраць усіх».
**18.35** «Акадэмія талентаў».
**21.05** «Кропля ў кроплю».
**23.55 Камедыя «Захрас у табе».**

### СТБ

**6.15 Серыял «Студэнты».**
**7.55 Камедыя «Міс Ніхто».**
**9.40** «Чыстая праца».
**10.35** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**11.30** «Мінск і мінчане».
**12.05** «Прыгоды дылетанта».
**12.40 Меладрама «Ніхто не заменіць цябе».**
**14.00** «Ваенная тайна».
**16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.40** «Дзіўная справа».
**18.35** «Разумней не прыдумаеш».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Маст. фільм «Тры метры над узроўнем неба».**
**22.25** «Зорны рынг. Новы сезон. Бітва кавер-бэндаў». THE JACKPOT BAND супраць PLAYBACK.
**23.30 Маст. фільм «Знахар».**
**1.45** «Вялікія тайны вечных бітваў».

### МІР

**5.00 Маст. фільм «Тапінамбуры».**
**7.35** «Ой, мамачкі».
**8.00** «Мільён пытанняў пра прыроду».
**8.15** «Эксперыментатары».
**8.30** «Мар! Дзейнічай! Будзь!».
**9.00, 15.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**9.10** «Любімыя акцёры».
**9.35 Маст. фільм «Радня».**
**11.20 Серыял «Рабіны гронкі пунсовыя».**
**14.35, 3.15** Скетч-шоу «МасГарСмех».
**15.10 Серыял «Сінія ночы».**
**20.40** «Навіны культуры».
**21.20 Маст. фільм «Агора».**
**23.40** Дак. фільм «Тайныя знакі».
**0.30 Маст. фільм «Каралі і капуста».**
**4.10** «Даведнік».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00 Маст. фільм «Ціхія сосны».**
**8.40 Маст. фільм «Дуэль».**
**10.20** «Ранішняя пошта».
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** «Планета сабак».
**12.25 Маст. фільм «Гран-па».**
**14.15** «Сумленны дэтэктыў».
**14.50** «Формула шчасця Марыі Пахоменкі».
**15.50** «Юрмала».
**16.50** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.45 Маст. фільм «Берагі».**
**0.10** «1/8 фіналу Цэнтральнай Міжнароднай лігі КВЗ».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.20** «Агляд».
**8.50** «Іх норавы».
**9.25** «Справа густу».
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.20** «Я худзею».
**14.20 Серыял «Другі забойны».**
**16.15** «Выратавальнікі».
**16.45** «Цёмны бок».
**17.35** «Вочная стаўка».
**18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**19.55** «Новыя рускія сенсацыі».
**20.55** «Ты не паверыш!».
**21.55 Маст. фільм «Збавенне».**
**23.35 Маст. фільм «Грамазека».**

### 8 КАНАЛ

**9.00, 13.20, 19.00, 20.55, 23.55** «Надвор'е».
**9.05** Мультпарад.
**9.15 Серыял «Плашч».**
**10.50** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**11.00 Драма «Доўгія гады рабства».**
**13.25 Трылер «Рыдзік».**
**15.30** Тэлемагазін.
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Прыгоды «Прагулка ў мінулае».**
**18.10 Серыял «Вікінгі».**
**19.05 Серыял «Светлячок».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** «Неверагодная магія».
**21.10 Драма «Пяць мінарэтаў у Нью-Ёрку».**
**23.15 Серыял «Каварныя пакаёўкі».**

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.30** М/ф «Смяшарыкі».
**9.00 Серыял «Татавы дочкі».**
**10.00** «Міксер».
**12.00** «Спытайце кухара».
**13.00 Серыял «Думай як жанчына».**
**15.00 Меладрама «Лапачка».**
**17.10, 23.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**17.30** «Уральскія пельмені».
**19.00 Серыял «Кухня».**
**20.30 Фантастыка «Госця».**
**23.15** Скетч-шоу «6 кадраў».
**0.00** «Лаві момант».
**0.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».

### КУЛЬТУРА

**5.30** «Еўраньюс».
**9.00** Біблейскі сюжэт.
**9.35 Маст. фільм «Дзікі сабака дзінга».**
**11.10** Вялікая сям'я.
**12.00** Пернікавы домік.
**12.30** Дак. фільм «Невідзімкі ў джунглях».
**13.25** «Красуйся, горад Пятроў!». Царскае Сяло.
**13.50, 0.55** Дак. серыял «Севастопальскія аповеды. Падарожжа ў гісторыю з Ігарам Залатавіцкім».
**14.35** Успамінаючы Віктара Слаўкіна. «Эпізоды».
**15.15** Спектаклі-легенды. «Дарослая дачка маладога чалавека».
**17.00** «Рамантыка раманса». Генадзь Гладкоў.
**17.55** Да 75-годдзя акцёра. «Лінія жыцця». Леў Прыгуноў.
**18.45 Маст. фільм «Звальненне на бераг».**
**20.15** «Белая студыя». Яўген Міронаў.
**20.55 Маст. фільм «Мусульманін».**
**22.40** «РОКавая ноч». The Doors. Канцэрт у Галівудзе.
**23.55** Дак. фільм «Невідзімкі ў джунглях».
**0.45** М/ф «Усе някемлівыя».
**1.40** «Сусветныя скарбы культуры».

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Чалавек і закон». 1994 год.
**5.30** «Няма за мяне шчаслівей!». Н.а. СССР Т. Шмыга. 1971 год.
**6.20, 0.30 «Час-не-чакае». Маст. фільм.**
**7.40** Канцэрт замежнай эстрады.
**8.00, 14.00, 2.00** «Мінулы час».
**9.00, 3.00** «Народжаны ў СССР».
**10.00** «Погляд». 1989 год.
**11.00** «Бачу цэль!». Дак. фільм.
**11.30** «Ранішняя пошта». 1991 год.
**12.05** «Нью-Ёрк, Нью-Ёрк». 1995 год.
**12.45 «Ён, яна і дзеці». Маст. фільм.**
**15.00** «Колба часу».
**16.00** «Кінапанарама». 1991 год.
**17.00** «Быў час»: «ГКЧП». 2004 год.
**17.55** «Песня года». 1972 год.
**19.20** «Вакол смеху». 1984 год.
**20.05** «Марат, Ліка і Леанідзік». Спектакль Маскоўскага тэатра «Ленкам».
**21.55** «Блакітны агеньчык». Першамайскі выпуск. 1982 год.
**23.00** «Чалавек, зямля, Сусвет». 1981 год.
**23.50** «Музыка ў тэатры, кіно на ТБ». 1985 год.
**1.45** «Добрай ночы, малыя». 1990 год.
**4.00** «Музычны рынг». 1989 год.

### EUROSPORT

**9.30** Тэлечасопіс WATTS.
**10.30, 16.30, 21.00, 1.00** Снукер. Чэмпіянат свету.
**15.00** All Sports.
**15.30** Аўтагонкі. Сусветная серыя Рэно.
**19.30, 0.00** Футзала. Кубак УЕФА. Фінал.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05** Скетчком «Паміж намі».
**5.15, 12.55, 21.00** Камедыя «Каток».
**5.45, 13.30, 21.25** Камедыя «Ціхая вуліца».
**6.15** Камедыя «Подыум».
**7.45, 8.40, 10.40, 12.40, 13.50, 16.45, 21.50, 3.05, 4.45** «Камедыянты. Лепшае».
**8.00, 16.00, 2.20** Камедыя «Праца».
**8.30, 16.30, 2.50** Камедыя «Ні на што не прыдатны, або Яго новая прафесія».
**9.00** Камедыя «Больш, чым сябар».
**11.15** Мюзікл «Другі хор».
**14.10** Камедыя «Няма чаго дэклараваць».
**17.20** Камедыя «Нянькі».
**19.20** Камедыя «Лысы нянька: спецзаданне».
**22.10** Камедыя «Вясельны пярэпалах».
**0.00** Камедыя «Усмешка Бога, або Чыста адэская гісторыя».
**3.25** Камедыя «Замарожаны».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.00, 5.10** Серыял «Сябры».
**11.00** «Сардэчна запрашаем дадому!».
**11.55, 1.00** «Тайны нашага кіно. «Адзінокім даецца інтэрнат».
**12.30, 1.30** Маст. фільм «Адзінокім даецца інтэрнат».
**14.10, 2.55** Дак. фільм «Сіндром Зомбі».
**15.15** М/ф «Ліс Рэнар».
**16.50, 3.50** Дак. фільм «Іншыя. Дзеці Вялікай Мядзведзіцы».
**18.20** Маст. фільм «Казакі-разбойнікі».
**21.50** Маст. фільм «Крутая Джорджыя».
**23.50** Серыял «Белы каўнерык».

### ТБ1000

**5.00** Баявік «Галівудскія копы».
**7.05** Трылер «Сачэнне».
**8.40** Прыгоды «Залаты Компас».
**10.45** Драма «Каханне».
**12.55** Баявік «Кілеры».
**14.45** Драма «Рэй».
**17.20** Меладрама «Бяспека не гарантуецца».
**19.00** Камедыя «Я нармальна супер гуд».
**20.50** Трылер «Суіні Тод, дэман-цырульнік з Фліт-стрыт».
**23.00** Трылер «Хаціна ў лесе».
**0.40** Драма «Каханне і гонар».
**2.20** Камедыя «Ужо хто б казаў 3».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Камедыя «Канікулы строгага рэжыму».
**8.00** Меладрама «Летам я аддаю перавагу вяселлю».
**10.00** Трагікамедыя «Кококо».
**12.00** Драма «Дзесяць гадоў без права перапіскі».
**14.00** Камедыя «2 дні».
**16.00** Дэтэктыў «Забойства на 100 мільёнаў».
**18.00** Меладрама «Мамы».
**20.00** Камедыя «З новым годам, мамы!».
**22.00** Трагікамедыя «Белы маўр, або Інтымныя гісторыі пра маіх суседзяў».
**0.00** Камедыя «Спартакіяда. Лакальнае пацяпленне».
**2.00** Драма «Залатое стагоддзе».
**4.00** Драма «Духless».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00** Найцяжэйшы ў свеце рамонт.
**6.00** Інжынерныя ідэі.
**8.00** З пункту гледжання навукі.
**10.00** Гульні розуму.
**11.00** Займальная навука.
**12.00, 17.00** Космас.
**13.00** Навука будучыні.
**14.00** Забытыя персанажы Бібліі.
**15.00** Рыбы-пачвары.
**20.00, 0.00, 3.00** Дзікі тунец.
**22.00, 2.00** Мегазаводы.
**23.00** Скарбашукальнікі.

### DISCOVERY

**7.00** Як гэта ўстроена?
**7.25, 19.10** Рэальныя дальнабойшчыкі.
**8.15, 13.40** Хуткія і гучныя.
**9.10, 2.40** Голыя і напалоханыя.
**10.05, 17.20** Залатая ліхаманка.
**11.00, 6.05** Ліквідатар.
**11.50** Бітвы за кантэйнеры.
**12.45, 5.10** Паляўнічыя на склады.
**14.35** Калекцыянеры аўто.
**15.30** Махінатары.
**16.25** Круцей не прыдумаеш.
**18.15, 3.30** Золата льдоў.
**20.05** Выжыванне без купюр.
**21.00** Гульня камянёў.
**22.00** Аўтападполле.
**23.00** Мафія раёнаў.
**0.00** Кландайк.
**0.55** Пытанні светабудовы.
**1.50** Пяцёрка лепшых.
**4.20** Маланкавыя катастрофы.
**4.45** Як гэта зроблена?

## НЯДЗЕЛЯ, 27 КРАСАВІКА

### БЕЛАРУСЬ 1

**5.55 Меладрама «Бесталковая нявестка».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Арсенал.
**9.40, 0.05 Серыял «Сваты 3».**
**10.45** «Пра ежу!».
**11.20** «XXL WOMAN TV».
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35** «Зона Х».
**13.15** Каробка перадач.
**13.50** Тайны следства.
**14.30** БеларусьLIFE.
**15.15** Твой горад.
**15.30** Мірны тур.
**15.50** Eurovision. Вынікі тыдня.
**16.10** «Зорнае жыццё». «Роля цаной у жыццё».
**17.20 Меладрама «Тры таварышы».**
**21.00** Галоўны эфір.
**21.55** Навіны надвор'я.
**22.15 Трылер «Вясна ў Парыжы».**
**23.25 Камедыя «Маленькі гігант вялікага сексу».**
**1.00** Хакей для ўсіх.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.40 Серыял «Ластаўчына гняздо».**
**8.35, 20.25** Тэлебарометр.
**8.40** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**9.55** Заўтра — гэта мы!
**10.30** «Два з паловай кухары. Адкрытая кухня».
**11.05, 21.40 Серыял «Інтэрны».**
**13.05** «Суперінтуіцыя. Каханне».
**14.15** Аўтабатл.
**14.50** Стыль-бюро.
**15.30 Прыгоды «Чалавек-павук 3: вораг у адлюстраванні».**
**18.00** «Comedy woman».
**19.15** Суперлато.
**20.05** «Кіпень».
**21.00** Спортлато 5 з 36.
**21.05** КЕНО.
**21.10** Цела чалавека.

### БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 10.50, 13.30, 14.55, 21.05, 0.00** «Калейдаскоп».
**8.05** «Сола для трубы». Дак. фільм.
**8.55 «Увесь гэты джаз». Маст. фільм.**
**11.00** «Гісторыя беларускай оперы». Дак. фільм.
**11.55** С. Пракоф'еў. «Маддалена». Опера Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі.
**12.40, 14.10, 15.30** «Размаўляем па-беларуску».
**12.45** «Росчырк часу».
**13.00 «Госць». Кароткаметражны фільм.**
**13.35** «Падарожжа са смакам».
**14.15** М/ф.
**14.30** «Творцы». Народны артыст Беларусі, рэжысёр Канстанцін Саннікаў.
**15.05** «Тэатральны ліцэй».
**15.35** «Пра каханне...». Драматычная гісторыя Барбары Радзівіл і Караля Жыгімонта II Аўгуста.
**16.05** «Наперад у мінулае».
**16.35 Дзіцячы фільм. «Чэснае чарадзейнае».**
**17.40, 23.35** «Культпрасвет».
**18.10 Сусветнае кіно. «Сталкер».**
**20.45** Калыханка.
**21.10** «Споведзь». Творчы вечар народнага артыста Расіі Мікалая Бурляева.
**22.05 «Ваенна-палявы раман». Маст. фільм.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.00—11.00** Тэніс. Турнір ВТА. Штутгарт. 1/2 фіналу.
**11.00, 13.30** Валейбол. Чэмпіянат Беларусі. Фінальная серыя.
**13.00, 0.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**15.30** Футбол. На шляху да ЧС-2014. Відэачасопіс.
**16.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Ліверпуль» — «Чэлсі».
